Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 48 (3952)
ЧАЦЬВЕР, 19 ЛЮТАГА
1931 г.
Цана нумару 5 коп.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

Партработу на вытворчасьці

на вышыню тэмпаў сацыялістычнага наступленьня

На XVI партзьезьдзе тав. Арджанікідзэ ў сваім дакладзе падкрэсьліў «якой магутнай сілай, якім магутным рухавіком на заводах зьяўляюцца нашы партыйныя ячэйкі». Гэта абсалютна правільнае палажэньне і ацэнка тэй вялізарнай сілы, якую складае сабой парт'ячэйка на прадпрыемстве, пацьвердзілі сотні і тысячы канкрэтных фактаў, даведзена ўсім пэрыядам змаганьня партыі за сацыялістычную індустрыялізацыю краіны.

Вытворчыя ячэйкі КП(б)Б у асноўнай сваёй масе, у абсалютнай большасьці, праявілі сябе на практычнай рабоце, як сапраўдныя кіруючыя штабы змаганьня шырокіх рабочых мас за поўнае выкананьне прамфінпляну ў яго колькасных і якасных паказальніках. Ячэйкі КП(б)Б фабрык і заводаў, вядучы бязьлітаснае змаганьне супроць правага ўхілу — галоўнай небясьпекі на даным этапе — і супроць усялякіх рэцэдывоў «левых» апартуністаў і прымірэнцтва да ўхілаў ад бальшавізму, правялі вялізарную работу па выкананьні баявых праграм разьвіцьця сацыялістычнай прамысловасьці. Выкарчоўваючы апартуністычную практыку, якая мела месца ў асобных зьвяньнях нізавых партарганізацый, беспаваротна выганяючы са сваіх радоў і зьнімаючы з кіруючых пастоў апартуністаў усіх копераў, вытворчыя парт'ячэйкі бязупынна мабілізуюць узросшую актыўнасьць рабочых мас на выкананьне намечаных партыяй вытворчых праграм. Парткалектывы раду фабрык і заводаў далі сапраўдныя ўзоры бальшавіцкай мабілізацыі пралетарскіх мас на поўнае ажыцьцяўленьне пёзунгу — Пяцігодка за чатыры гады.

Задачы завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР у трэцім годзе пяцігодкі прад'яўляюць вытворчым партколектывам яшчэ больш высокія, больш адказныя патрабаваньні. Яны, гэтыя патрабаваньні, зводзяцца да таго, каб партыйныя арганізацыі фабрык і заводаў усёй сваёй дзейнасьцю і практычнай работай забясьпечылі высокія тэмпы разьвіцьця прамысловасьці, забясьпечылі поўнае выкананьне вытворчых праграм па колькасных і якасных паказальніках. А гэтыя праграмы па сваіх разьмерах грандыёзныя. Каб упэўніцца ў гэтым, даволі паказаць на тое, што капітальныя ўкладаньні на бягучы год па прамысловасьці ВСНГ Беларусі намечаны ў суме 43.680 тыс. рублёў, а рост валавой прадукцыі вызначаецца ў 74 проц. Гэтыя намячэньні, а таксама намячэньні па якасных паказальніках, па зьніжэньні сабекошту будуць выкананы толькі пры тэй умове, калі парт-арганізацыі ўсіхо без выключэньня, фабрык і заводаў сваю работу паставяць на ўзровень адпаведны тэмпам сацыялістычнага наступленьня, падначаляць усю сваю дзейнасьць задачам поўнага выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну. ПАДНАЧАЛІЦЬ СВАЮ РАБОТУ ВЫКАНАНЬНЮ ПРАМФІНПЛЯНУ, Г. ЗН. ПЕРАБУДАВАЦЬ ПАРТРАБОТУ ТАК, КАБ УВЕСЬ ЧАС СТАЯЦЬ ТВАРАМ ДА ЗАДАЧ ВЫТВОРЧАСЬЦІ, ЯК МАГА ЛЕПШ АДЧУВАЦЬ ПУЛЬС СВАЁЙ ФАБРЫКІ І ЗАВОДУ.

Якія мэты ставіць перабудова партработы?

Па-першае, як мага лепш і паўней скарыстаць гіганцкі ўзросшую актыўнасьць рабочых мас і накіраваць яе на шырокае разгортваньне і ўкараненьне сацыялістычных мэтадаў працы. Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва зьяўляюцца магутным рухавіком паскарэньня тэмпаў сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі. Таму работа партарганізацый на вытворчасьці павінна быць асноўнай сваёй увагай накіравана на ўмацаваньне кіраўніцтва сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарніцтвам, на поўнае ахапленьне імі шырокіх мас рабочых. Бо не сакрэтам зьяўляецца тое, што ў радзе выпадкаў («Чырвоная Бярэзіна»—Барысаў і інш.) мы мелі развал ударных брыгад толькі таму, што апартуністы, апынуўшыся на чале партыйных арганізацый, не аддавалі ніякай увагі справе замацаваньня і ўздыму на вышэйшую ступень ударніцтва і сацспаборніцтва.

Выганяючы беспаваротна апартуністаў са сваіх радоў, партыйныя арганізацыі павінны яшчэ больш разьвіваць актыўнасьць мас і праз ударныя брыгады і сацыялістычнае спаборніцтва накіроўваць на выкананьне асноўнай палітычнай задачы — ажыцьцяўленьне пяцігадовага пляну за чатыры гады.

Па закліку правадыра партыі і рабочае клясы, тав. СТАЛІНА, пралетары буйнейшых прадпрыемстваў выступілі ў ПАХОД ЗА АЎЛАДАНЬНЕ ТЭХНІКАЙ. Задача партыйных арганізацый заключаецца ў тым, каб адразу-ж стаць на чале гэтай новай хвалі пралетарскай актыўнасьці, накіраванай на хутчэйшае выкананьне бальшавіцкага пёзунгу «дагнаць і перагнаць». Разгортваючы работу вакол пытаньня ўзбраеньня тэхнічнымі ведамі, ячэйкі КП(б)Б павінны стварыць усе ўмовы для таго, каб масы старых рабочых, каб рабочыя партыйцы і самыя шырокія масы пралетарыяту змаглі ў найкаракейшы тэрмін аўладаць усімі вытворчымі працэсамі, уніхнуць ва ўсе дэталі вытворчасьці, засвоіць новую тэхніку, разгарнуць барацьбу за мэханізацыю ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі.

Наступнае галоўнейшае пытаньне — гэта ЗМАГАНЬНЕ ЗА ЯКАСЬЦЬ ПРАДУКЦЫІ. Бяз гэтага змаганьня, без каранёвага паляпшэньня якасьці прадукцыі ня можа быць поўнага забясьпячэньня пасьпяховага руху наперад, ня можа быць паляпшэньня матар'яльнага ўзроўню рабочае клясы. Таму пытаньне павышэньня якасьці прадукцыі павінна быць пастаўлена парт'ячэйкамі на першы плян у сваёй рабоце. Перш за ўсё парт'ячэйкі павінны дабіцца поўнага разуменьня самімі шырокімі масамі рабочых таго палажэньня, што пепшым ударнікам зьяўляецца той рабочы, які выконвае ня толькі колькасныя, але і якасныя паказальнікі, які штодзенна за варштатам вядзе актыўнае змаганьне за якасьць прадукцыі. УДАРНІЦТВА І САЦСПАБОРНІЦТВА ПАВЯРНУЦЬ НА РЭЙКІ ЗМАГАНЬНЯ ЗА ЯКАСЬЦЬ — АДЗІН З ВАЖНЕЙШЫХ МОМАНТАЎ У ЗМАГАНЬНІ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ ЗА ЯКАСЬЦЬ ПРАДУКЦЫІ. Гэта, зразумела, зусім ня значыць, што хоць у найменшай ступені можа быць паспаблена змаганьне за перавыкананьне колькасных паказальнікаў. Наадварот — яно павінна быць узмоцнена. Паварот ударніцтва тварам да задач павышэньня якасьці павінен суправаджацца МАСАВАЙ АРГАНІЗАЦЫЯЙ БРЫГАД ПА ВЫПУСКУ ЎЗОРНАЙ ЯКАСЬЦІ ПРАДУКЦЫІ. Штодзенная работа па павышэньні якасьці, па зьніжэньні сабекошту прадукцыі, зьнішчэньне браку, павышэньне прадукцыйнасьці працы, — вось вузлавыя пытаньні праграмы гэтых брыгад.

Вытворчая праграма трэцяга году пяцігодкі — напружаная. Але гэта ні ў якім выпадку не азначае, што яе нельга выканаць. Жыцьцё дзесяткі раз пацьвердзіла, што бальшавіцкія намячэньні магчымы да выкананьня. Для іх выкананьня заложаны вялізарныя магчымасьці: па-першае, у самой сыстэме савецкага ладу і ў плянавым пачатку ў нашай эканоміцы, па-другое, у невычарпальнай актыўнасьці рабочае клясы, па-трэцяе, у тых прыродных багацьцях, якімі ўладае краіна Саветаў і, нарэшце, у тэй моцнай сацыялістычнай базе, якая падведзена папярэднімі двума гадамі пяцігодкі. Праграма трэцяга году павінна быць і, бязумоўна, будзе выканана. Трэба толькі ўсю бальшавіцкую энэргію партыйных арганізацый і шырокіх рабочых мас накіраваць на поўнае скарыстаньне ўсіх унутраных рэсурсаў, на поўную нагрузку рабочага дня і абсталяваньня, на змаганьне з прастоямі, спазьненьнямі на работу і на ліквідацыю іншых момантаў, якія б'юць па выкананьні прамфінпляну. Між іншым, трэба паказаць на тое, што на радзе прадпрыемстваў гэтыя ўнутраныя рэсурсы не скарыстоўваюцца. Апошняе пацьвярджаецца тым, што рад даволі буйных прадпрыемстваў Менску («Энэргія», «Камунар», «Кастрычнік») не давыканалі ў студзені сваіх вытворчых заданьняў.

Паставіць у цэнтр сваёй увагі і практычна кіраваць вырашэньнем галоўных вытворчых задач партарганізацыі змогуць толькі ЦЯСНЕЙ ЗЬВЯЗАЎШЫСЯ З МАСАМІ РАБОЧЫХ, ГЛЫБЕЙ ВЫВУЧЫЎШЫ ВЫТВОРЧЫЯ ПРАЦЭСЫ І МАГЧЫМАСЬЦІ СВАІХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ. Гэта дасягнецца пераняньнем дзяжару ўсёй партыйнай работы ў цэх, брыгаду, групу, набліжэньнем палітычна-масавай работы да мас. Рад партыйных арганізацый буйнейшых прадпрыемстваў у гэтых адносінах дасягнулі даволі значных посьпехаў (завод «Пралетары», «Палесдрук»—Гомель, «Бальшавік» — Менск). На «Бальшавіку», напрыклад, сабран даволі значны вопыт па перабудове партыйнай работы. Там партыйная група стала першапачатковым зьвяном партарганізацыі заводу. Яна нясе поўную адказнасьць за выкананьне партыйных дырэктыў у сваёй брыгадзе. Асноўнай задачай, якую выконвае група, зьяўляецца: павышэньне практычнага ўдзелу камуністаў і рабочых у арганізацыі вытворчасьці, кіраўніцтва садспаборніцтвам, ударніцтвам, павышэньне прадукцыйнасьці працы, працоўнай дысцыпліны, рацыяналізацыя і змаганьне са стратамі на вытворчасьці, праверка выкананьня камуністамі партыйных абавязкаў, асабліва іх работы, як ударнікаў.

Кіраўніцтва партгрупамі пастаўлена так, што кіраўніцтва парткалектыву заўсёды мае магчымасьць прасачыць за дзейнасьцю групы, праверыць выкананьне ёю даных дырэктыў. Ня менш каштоўны вопыт мы маем і на іншых прадпрыемствах. НА ГОМЕЛЬСКІМ ЗАВОДЗЕ «ПРАЛЕТАРЫ» перабудовай партработы дасягнута тое, што парт'ячэйкі заўсёды маюць магчымасьць своячасова рэагаваць на ўсякія найменшыя недахопы на вытворчасьці, падхопліваць ініцыятыву і актыўнасьць рабочых мас і ўзьнімаць яе на вышэйшую ступень. Парткалектыў мае магчымасьць баявымі тэмпамі пераносіць усякае новае мерапрыемства таго ці іншага цэху і распаўсюджваць на ўвесь завод.

Вялікае значэньне набывае і правільная расстаноўка партыйных сіл. Не сакрэт, што партработа ў начных зьменах пастаўлена далёка нездавальняюча. Гэта пытаньне—правільная расстаноўка партыйных сіл—адыгрывае вялікае значэньне ў змаганьні парт'ячэйкі за прамфінплян. Таму гэтай справе трэба аддаць такую ўвагу, якой яна па праве заслугоўвае.

Праверка выкананьня—аснова своячасовага і поўнага ажыцьцяўленьня партыйных дырэктыў. Праз наданьне вытворчага характару партыйнай нагрузцы, праз штодзенны нагляд за тым, як кожны з камуністаў выконвае даручаную яму работу, парт'ячэйкі павінны дабівацца такога становішча, каб ні адно даручэньне, якое дана партыйцу, не заставалася, як гэта часта бывае, забытым.

Камуністы—перадавікі сярод ударнікаў. Да рэчы, на радзе фабрык мы маем такія факты, якія сьведчаць аб тым, што гэта палажэньне ня выконваецца. Мы яшчэ маем рад фактаў, калі паасобныя камуністы ня толькі не зьяўляюцца ўзорам на вытворчасьці, а наадварот, плятуцца ў хвасьце адсталых элемэнтаў, а часамі нават адкрыта патураюць тым кулацкім элемэнтам, якія выпадкова трапілі на завод. Пераняньнем партработы ў цэх, у нізавое зьвяно, партыйныя ячэйкі маюць магчымасьць прасачыць за работай кожнага камуніста, праверыць наколькі ён каля варштату зьяўляецца прыкладным для беспартыйных рабочых.

Толькі павышэньнем якасьці партыйнай работы і партыйнага кіраўніцтва, уносячы ў яго БОЛЬШ КАНКРЭТНАСЬЦІ І АПЭРАЦЫЙНАСЬЦІ, парт'ячэйкі на прадпрыемствах змогуць заўсёды весьці за сабою масы рабочых на выкананьне вытворчых праграм. Толькі выганяючы са сваіх радоў носьбітаў праваапартуністычнай практыкі—кулацкую агентуру—партыйныя ячэйкі здолеюць згуртоўваць актыўнасьць мас пралетарыяту, узьнімаць яе на вышэйшую ступень і накіроўваць на завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР у трэцім годзе пяцігодкі.

Уся тая сіла, якую складаюць сабой парт'ячэйкі на вытворчасьці, павінна быць накіравана на забясьпячэньне бальшавіцкіх тэмпаў сацыялістычнай індустрыялізацыі. Ячэйкі КП(б)Б фабрык і заводаў сваю назву — магутных рухавікоў—апраўдаюць у бязьлітасным змаганьні за выразнае і поўнае праядзеньне генэральнай лініі партыі.

Рабочыя-лесарубы СССР

даюць рашучы адпор міжнародным драпежнікам

Антысавецкая кампанія часткі друку Эўропы і Амэрыкі аб так званай «прымусовай працы» на лесазагатоўках у СССР выклікала глыбокае абурэньне рабочых-лесарубаў. У Архангельскую газэту «Правда Севера» паступіла вялізарнейшая колькасьць лістоў, пратэстаў, розных здымкаў і дакумантаў, якія абвяргаюць гэтыя выдумкі. Газэта ў артыкуле пад загалоўкам «Энтузіязм не нараджаецца з нявольніцтва» падводіць вынік усяму гэтаму матар'ялу, аб разьмерах якога дае ўяўленьне колькасьць атрыманых лістоў. Да апошняга часу ў рэдакцыю паступіла 3.343 лісты ад рабочых-лесарубаў з самых далёкіх куткоў неабсяжнай Савецкай краіны.

На аснове гэтых вестак можна сказаць, што не засталося ні аднаго абвінавачаньня, якое-б не знайшло ў іх дакумантальнага абвяржэньня. Буржуазны друк балбатаў аб тым, што лесарубы ходзяць у лахманох, не атрымліваюць пайка і ўміраюць з голаду. У сапраўднасьці, як заяўляюць самі рабочыя, кожны лесаруб, што прыбывае на работу, атрымлівае, у першую чаргу, поўны камплект спэцвопраткі. У гэты камплект уваходзіць: нажух, валёнкі, ватныя штаны, фуфайка, рукавіцы і шапка. Газэта, паведамляючы аб гэтым, зараз-жа пацьвярджае весткі спэцыяльным лістом брыгады рабочых, якая працуе ў 17 кілёмэтрах ад Котмас. Рабочыя пішуць, што яны ў першы-ж дзень прыезду атрымалі ўвесь камплект поўнасьцю.

Той-жа малюнак у адносінах харчаваньня. Рабочыя на лесазагатоўках атрымліваюць кожны месяц ад 100 да 150 клгр. мукі, ад 14 да 18 клгр. круп, да 2 з паловай клгр. цукру, да 100 клгр. сырой гародніны і да 20 клгр. рыбы. Зноў усе гэтыя весткі пацьвярджаюцца шматлікімі лістамі з уласнымі подпісамі рабочых.

Аб тым, што існуе «прымусовая праца» лепш за ўсё гавораць лісты рабочых розных лесапільных заводаў Архангельску і Паўночнага краю. Так, рабочыя аднаго архангельскага заводу пішуць: «сьмешна нават гаварыць аб работу, атрымліваю, у першую чаргу, поўны камплект спэцвопраткі. У гэты камплект уваходзіць: нажух, валёнкі, ватныя штаны, фуфайка, рукавіцы і шапка. Газэта, паведамляючы аб гэтым, зараз-жа пацьвярджае весткі спэцыяльным лістом брыгады рабочых, якая працуе ў 17 кілёмэтрах ад Котмас. Рабочыя пішуць, што яны ў першы-ж дзень прыезду атрымалі ўвесь камплект поўнасьцю.

Той-жа малюнак у адносінах харчаваньня. Рабочыя на лесазагатоўках атрымліваюць кожны месяц ад 100 да 150 клгр. мукі, ад 14 да 18 клгр. круп, да 2 з паловай клгр. цукру, да 100 клгр. сырой гародніны і да 20 клгр. рыбы. Зноў усе гэтыя весткі пацьвярджаюцца шматлікімі лістамі з уласнымі подпісамі рабочых.

Аб тым, што існуе «прымусовая праца» лепш за ўсё гавораць лісты рабочых розных лесапільных заводаў Архангельску і Паўночнага краю. Так, рабочыя аднаго архангельскага заводу пішуць: «сьмешна нават гаварыць аб прымусовай працы на нашым заводзе, дзе з 2.015 рабочых — 1.845 ударнікаў».

У другім лісьце заводу № 2, пад якім ёсьць подпісы 243 чалавек, гаворыцца: «Мы ўсе—пралетары, прышлі на завод з працоўнай вёскі па ўласнай волі». І такіх лістоў—без канца.

І, вядома, яны ўсякага бесстароньняга чалавека пераконваюць больш, чым розныя выдумкі «досужых очевидцев».

Цікава адзначыць, што буржуазная газэта «Гандэлэ Бэўд» зьмясьціла артыкул пад загалоўкам «На лесазагатоўцы ў Архангельску», у якім, наперакор звычаю буржуазнага друку, з вялікай пахвалай гаворыць аб усіх культурных установах архангельскіх рабочых і маракоў.

Апрача таго, «Правда Севера» зьмяшчае рад лістоў замежных рабочых і маракоў, якія пабылі ў Архангельску, Анэзе, Мезені, якія таксама рашучым чынам абвяргаюць чуткі і байкі аб «прымусовай працы».

Пастанова ЦК КП(б)Б аб ходзе падрыхтоўчай работы да веснавой пасеўнай кампаніі

ЦК КП(б)Б адзначае, што падрыхтоўчая работа да веснавой пасеўнай кампаніі праходзіць зусім нездавальняюча і асабліва ў наступных важнейшых галінах:

а) Усё яшчэ слабое нарастаньне тэмпаў калектывізацыі, існаваньне самацёку і правага апартунізму ў радзе партыйных арганізацый у справе арганізацыі новага прыліву бядняцка-серадняцкіх мас у калгасы, што было падкрэслена студзеньскім пленумам ЦК КП(б)Б.

б) У давядзеньні пасеўных плянаў да калгасаў і бядняцка-серадняцкіх гаспадарак (49 проц. у калгасах і 35 проц. у аднаасобных гаспадарках на 1 лютага 1931 г.). Асабліва недапушчальным зьяўляецца тое, што ў раёнах не даведзены яшчэ цьвёрдыя пляны сяўбы і загатовак насеньня да кулацкіх і заможных гаспадарак.

в) Стварэньне насенных і страхавых фондаў не пастаўлена ў цэнтр увагі раённых арганізацый і асабліва мэрудна вядзецца загатоўка насеньня нармавых траў, коранаплодаў і гародных культур, што ставіць пад пагрозу зрыву намечаныя пад сяўбу плошчы. Давядзеньне пасеўных плянаў ня ўвязваецца з забясьпячэньнем абсемяненьня намечаных пасеўных плошчаў. Замест мабілізацыі калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства на стварэньне насенных фондаў у раёнах—значная частка раённых арганізацый арыентуецца на завоз насеньня.

г) Прасоўваньне сельска-гаспадарчых машын і ўгнаеньня, а таксама рамонт трактараў не забясьпечаны адпаведнай працай з боку забясьпечваючых арганізацый (Белсельсаюз, Трактарцэнтр, спэцыяльныя віды каапэрацыі і інш.) і карыстальнікаў трактараў.

д) ЦК КП(б)Б адзначае асабліва дрэнна пастаўленую працу да веснавой пасеўнай кампаніі ў Гарадоцкім, Межанскім, Бешанковіцкім, Багушэўскім, Капыльскім, Стара-Дароскім, Церахаўскім, Расьнянскім і Ўраравіцкім раёнах.

ЦК КП(б)Б лічыць, што асноўнай прычынай нездавальняючай работы па падрыхтоўцы веснавой сяўбы зьяўляецца бязьдзейнасьць значнай часткі раённых партыйных арганізацый і райвыканкомаў у гэтай справе, а таксама адсутнасьць неабходнай гнуткасьці і апэратыўнасьці і праверкі выкананьня дырэктыў у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы з боку Наркамзему, Калгасцэнтру, Белсельсаюзу і цэнтральных кіруючых органаў с.-г. каапэрацыі. Адсутнічаньне дысцыпліны ў раённых установах у сэнсе своячасовага прадстаўленьня вестак і матар'ялаў аб ходзе падрыхтоўкі веснавой сяўбы.

Выходзячы з такога становішча падрыхтоўкі сяўбы і адзначаючы невыкананьне дырэктыў ЦК па гэтым пытаньні, ЦК КП(б)Б прапануе ўсім раённым партыйным арганізацыям, райвыканкомам і цэнтральным установам зараз-жа прыняць усе захады да выкананьня дырэктыў студзеньскага пленуму ЦК і асобных пастаноў ЦК па гэтым пытаньні.

1. Лічыць неабходным з 20-га лютага па 2-е сакавіка правесьці дэкаду праверкі работы па стварэньні насенных і страхавых фондаў як у калгасах, так і, асабліва ў аднаасобных гаспадарках, па давядзеньні пасеўных плянаў, рамонце і прамысловасьці сельска-гаспадарчых машын. Даручыць райкомам, па сканчэньні дэкады праверкі, абгаварыць яе вынікі на бюро РК і спэцыяльным лістом інфармаваць ЦК КП(б)Б аб выніках дэкады і намечаных мерапрыемствах.

Правядзеньне дэкады ўскласьці на агітмасавы аддзел ЦК, Наркамзем і рэдакцыю «Зьвязды».

2. Ускласьці пэрсанальную адказнасьць за выкананьне плану загатовак насеньня на кіраўнікоў Белкаапсаюзу (Хвэскін), Белільнасаюзу (Лаціс), Белсадсаюзу (Панамароў) і Белмалжывсаюзу (Краскоўскі) і палярэдзіць іх, што пры няпрыняцьці рашучых мер да стварэньня пералому ў загатоўках насеньня (асабліва траў і гародных культур) у працягу чарговай дэкады, ЦК рашуча паставіць пытаньне аб прыцягненьні да партыйнай адказнасьці.

3. Абавязаць т. т. Талэпілу, Міцькова, Лаціса і Варабёва забясьпечыць поўную рэарганізацыю на працягу месячнага тэрміну сельска-гаспадарчых машын і ўгнаеньня. Правесьці шырокую масавую работу вакол арганізацыі адходу калгасьнікаў на заработкі з мэтай мабілізацыі сродкаў для набыцьця машын, а таксама разгарнуць шырокую работу па мабілізацыі сродкаў калгасьнікаў у парадку пазычак калгасу для гэтай-жа мэты.

Даручыць РСІ арганізаваць шырокую масавую праверку наяўнасьці на складах с.-г. машын і ходу іх рэалізацыі. Праз дэкаду аб выніках праверкі інфармаваць ЦК КП(б)Б.

4. Адзначаючы выключна нездавальняючае становішча з забясьпячэньнем гаручага і змазачных матар'ялаў хавальнікамі, ускласьці адказнасьць на Наркамзем, ВСНГ, упаўнаважанага НК Шляхоў Зносін, Белкаапсаюз і сыстэмы с.-г. каапэрацыі за мабілізацыю цыстэрнаў, бочак і перакідну іх у раёны дзейнасьці МТС і трактарныя паркі саўгасаў.

Разгарнуць вакол мабілізацыі хавалішчаў гаручага шырокую масавую работу, усім ячэйкам КП(б)Б праверыць наяўныя рэсурсы з тым, каб выкарыстаць усе маючыяся хавалішчы.

5. Адзначаючы, што да гэтага часу не разгорнуты абмен і перасоўваньне не-

ЦК УсеКП(б)

АБ РАБОЦЕ ГОМЕЛЬСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ

З пастановы

ЦК УсеКП(б)

МАСКВА, 18. Адзначаючы рад дасягненьняў гомельскай партарганізацыі ў справе індустрыялізацыі раёнаў і згуртаваньня сваіх радоў вакол генэральнай лініі партыі, ЦК разам з тым канстатуе: гомельская партарганізацыя на здолела забясьпечыць выкананьня прамфінпляну на буйнейшых прадпрыемствах раёну, а таксама ў Гомельскім чыгуначным вузьле. Гомельская партарганізацыя і асабліва гарком партыі не перабудавалі сваёй работы ў адпаведнасьці з задачамі, што сталі перад імі. ЦК прапануе гомельскаму гаркому і кіруючым рэспубліканскім арганізацыям неадкладна і рашуча зьнішчыць недахопы і забясьпечыць поўнае выкананьне вытворчых праграм прамысловасьці і транспарту у 1931 годзе, мабілізуючы на гэта партарганізацыю і шырокія рабочыя масы. ЦК УсеКП(б) павінен узяць пад свой непасэрэдны нагляд работу Гомельскага вузла і праз тры месяцы праверыць работу партарганізацыі пад кутом погляду выкананьня дырэктыў ЦК па транспарце.

Адзначаючы невыстарчальны тэмп нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў Гомелі, ЦК УсеКП(б) прапануе гаркому ў гадавы тэрмін закончыць у асноўным беларусізацыю партыйных, савецкіх, прафэсыянальных апаратаў і культурна-бытавых устаноў (школа, бібліятэка, клюб). Партарганізацыя павінна павесьці больш рашучую барацьбу з праяўленьнямі вялікарасійскага шавінізму, як з галоўнай небясьпекай у правядзеньні нацыянальнай палітыкі партыі, узмацніўшы ў той-жа час выкрыцьцё і барацьбу з праяўленьнямі беларускага нацыянал-дэмакратызму, а таксама яўрэйскага і польскага нацыянал-шавінізму, выхоўваючы на гэтай барацьбе партарганізацыю і шырокія рабочыя масы ў духу ленінскай нацыянальнай палітыкі.

БУРЖУАЗНАЯ ПЯЦІДНЕЎКА ЗА КОШТ РАБОЧЫХ

БЭРЛІН 17. З прычыны машэньніцкай балбатні буржуазнага і сацыял-дэмакратычнага друку аб увядзеньні пяцідненькі на нямецкіх прадпрыемствах «Ротэ Фане» піша:

«Увядзеньне пяціднёвага тыдню ў берлінскай металёвай прамысловасьці, якое афішуецца капіталістычная прэсай, як вялізарнейшы праект, ня мае нічога супольнага з сацыялістычнай пяціднёвай Савецкага Саюзу. Там рабочыя пры поўным захаваньні зарплаты маюць дзень адпачынку пасьля кожных чатырох рабочых дзён. Капіталістычны-ж пяціднёвы тыдзень прадстаўляе нішто іншае, як звычайнае скарачэньне рабочага тыдню (у мэтах скарачэньня вытворчасьці) з 48 гадзін да 40 гадзін. Пры гэтым рабочыя, зразумела, будуць атрымліваць зарплату за 40 гадзін. Па вылічэньні «Ротэ Фане» увядзеньне пяціднёвага тыдню дасьць зьніжэньне зарплаты на 25,6 проц. Трэба адзначыць, што буржуазная і сацыял-дэмакратычная прэса, даючы сабе справадачу ў тым, якой папулярнасьцю карыстаецца ў асяроддзі нямецкіх рабочых практычны вопыт правядзеньня пяціднёўкі ў ажыцьцяўленьні пяцідтодні ў Савецкім Саюзе, прабуюць скарыстаць слова «пяціднёўка» для сваіх эксплёататарскіх мэт.

ЗАСТАЛОСЯ 6 ДЗЁН

ДА СКАНЧЭНЬНЯ ДВУХДЭКАДНІКА ШТУРМУ ЗА ЛЁН

ПА СЛУЦКІМ, АСЬВЕЙСКІМ І ЛЕПЕЛЬСКІМ РАЁНАХ ЗРУХУ НЕ ДАСЯГНУТА. У СІРОЦІНСКІМ РАЁНЕ АПАРТУНІСТЫ ЗЬНЯТЫ З РАБОТЫ

Неадкладна прымусіць кулака выканаць цьвёрдыя заданьні, бязьлітасна біць па канкрэтных носьбітах праваапартуністычнай практыкі, якія зрываюць штурм за лён

Рашучы ўдар па праваапартуністычнай практыцы

СІРОЦІНА. (Наш кар.). На 10 лютага па Сіроцінскім раёне паступіла ільнавалакна 27 проц. гадавога заданьня.

Цьвёрдыя нормы даведзены да 529 кулацкіх гаспадарак у разьмеры 56 тон. На 5 лютага кулацкімі гаспадаркамі здана 39,5 тон ільнавалакна. Кулакі, адчуваючы зусім слабы націск з боку сельсаветаў, усяляк тармозяць ход ільна загатовак. У Жарэбіцкім сельсавеце адзін кулак заплаціў 250 рублёў штрафу і голасна заявіў:

— Лепш штраф заплачу, а ільнавалакна ня дам саветам.

Ня гледзячы на рад катэгарычных дырэктыў партыі, прафсаюзы ня прымалі ўдзелу ў рабоце па загатоўках.

Ходам загатовак падзвычай слаба кіравалі райкалгасаюз, райкаапсаюз, райспажыўтаварыства і райгандаль. Адсутнічаў кантроль над праверкай даных дырэктыў райкомам партыі і райвыканкомам.

Райком партыі, правяраючы ход ільназагатовак, прыняў рад суровых захадаў у адносінах да кіраўнікоў тых арганізацый, якія не спраўляліся з пастаўленымі перад імі задачамі.

За бязьдзейнасьць у рабоце райком партыі распусьціў праўленьне райкаапсаюзу. Шэр — член праўленьня райкаапсаюзу — выключаны з партыі. Старшыня райкалгасаюзу Трызна і старшыня райпрафсавету — тав. Кофман зьняты з работы. Справа аб апошнім перадана на разгляд у РКК.

Для ліквідацыі прарыву райком партыі накіраваў у сельсаветы 11 рабочых брыгад.

КУРКЕВІЧ.

Няма паляпшэньня

ПУХАВІЧЫ, 18. (Па тэлефону). Ход загатовак ільнавалакна па Пухавіцкім раёне не палепшыўся.

Люты рашаючы месяц ільназагатовак—пагуль што не дае ніякага пералому ў рабоце загатоўчых арганізацый.

Плян загатовак ільнавалакна і ільнянога семя выкананы на 40 проц. Мясцовыя партыйныя, савецкія і грамадзкія арганізацыі справе ільназагатовак усё яшчэ не аддаюць ніякае ўвагі.

Некаторыя калгасы не здаюць сваіх запасаў ільнавалакна і ільнянога семя.

У калгасе «Зара», Сінчанскага сельсавету, ільном падсьпіваюць коням. У калгасе «Бязбожнік» 6 вазоў неаббітага ільну ляжыць на дварэ пад адкрытым небам. Усё гэта вынік апартуністычнай практыкі праўленьняў гэтых калгасаў.

Вельмі адстае ў выкананьні сваіх ільназагатоўчых плянаў Навасёлкаўскі сельсавет, які не давёў цьвёрдых заданьняў ні да аднэй кулацкай гаспадаркі.

Ніякіх мер, каб прыцягнуць да адказнасьці канкрэтных носьбітаў зла, ня прынята.

Адпаведным органам патрэбна зацікавіцца становішчам ільназагатовак у раёне.

Селькор Р. ПРОЗ.

Першая дэкада штурму дала толькі 1,7 проц. пляну

СЛУЦАК, 18. Слуцкі раён павінен загатовіць 180 тон ільнавалакна.

Раённыя загатоўчыя арганізацыі высунулі свой сустрэчны плян і абавязаліся даць 205 тон.

Але тэмпы работы на ільназагатоўчым фронце ўсё яшчэ не гарантуюць пасьпяховага выкананьня намечаных плянаў.

Першая дэкада штурму павялічыла процант выкананьня пляну загатовак на 1,7 проц., давёўшы яго да 26 проц.

Цьвёрдыя заданьні даны 500 кулацкім гаспадаркам. Райвыканком і сельсаветы не праверылі яшчэ як выконваюць кулакі заданьні. У раёне ніхто ня ведае наколькі процантаў выканала сваё заданьне кулацка-заможная частка вёскі.

Калгасы, якія кантрактавалі свае пасевы ільну, яшчэ ня выкапалі сваіх абавязацельстваў.

Загатоўчыя арганізацыі не разгарнулі сапраўды баявой работы ў барацьбе за лён. Кампанія загатовак ільнавалакна праходзіць у радзе месц самацёкам.

Райвыканком і сельсаветы вельмі слаба націскаюць на кулака, які сваёй агітацыяй імкнецца сарваць пляны загатовак ільнавалакна і ільнянога семя.

На ліквідацыю прарыву райком партыі, камсамол і прафсаюзы толькі 12 лютага паслалі ў сельсаветы 30 чал. брыгадзіраў.

Бараноўскі.

Без перамен

АСЬВЕЯ, 18. (Па тэлеграфу). На 15 лютага загатоўлена па Асьвейскім раёне ільнавалакна замест 450 тон толькі 106, што складае 23 проц. гадавога заданьня.

Першая дэкада штурму дала павышэньне ўсяго на 2 проц. за кошт загатовак па аднаасобным сэктары. Калгасы ў дэкаду ня здалі ніводнага кілёграма.

Ільнаканапляводзеяюз ня ведае да якой колькасьці кулацка-заможных гаспадарак даведзены цьвёрдыя заданьні. Злосныя нездатчыкі ня прыцягваюцца да судовай адказнасьці.

Дрысенскі завод па першапачатковай апрацоўцы ільну ня ідзе насустрач калгасам і адмаўляецца прымаць трасту для апрацоўкі.

Райарганізацыі не пераключыліся на баявыя тэмпы правядзеньня штурму.

Брыгадзір «Зьвязды»—
Воінаў і Фрадзін.

Ільназагатоўкамі ня цікавяцца

ЛЕПЕЛЬ, 18. (Па тэлеграфу). Першая дэкада штурму не дала належнага эруху ў ходзе загатовак ільнавалакна па Лепельскім раёне.

Гадавое заданьне выканана ўсяго на 27,7 проц.

Раённыя арганізацыі не вядуць стапага вучоту ходу загатовак. Райкалгасаюз, райкалгассаюз і сельсаветы ня цікавяцца ільназагатоўкамі.

ДЫРЭКТЫВЫ АБ СПАГНАНЬНІ ЦЬВЁРДЫХ ЗАДАНЬНЯЎ З КУЛАЦКА-ЗАМОЖНАЙ ЧАСТКІ ВЁСКІ СЕЛЬСАВЕТАМІ І ЎПАЎНАВАЖАНЫМІ РАЙВЫКАНКОМУ НЯ ВЫКОНВАЮЦЦА.

У Несьляскім сельсавеце з 19 кулацкіх гаспадарак толькі адна выканала сваё заданьне.

Брыгадзіры «Зьвязды»
МАРЧУК і РАДЗЮК.

З-ці пленум ЦКК КП(б)Б

На вячэрнім пасяджэньні 17-га лютага пленум заслухаў даклад тав. Гурэвіча аб праверцы ходу калектывізацыі і падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі.

Тав. Гурэвіч у сваім дакладзе шырока ахарактарызаваў становішча калектывізацыі сельскай гаспадаркі, спэцыялізацыі саўгасаў і калгасаў, працэсы клясавай барацьбы ў вёсцы і задачы партыйных, савецкіх калгасна-каапэрацыйных і прафсаюзных арганізацый у справе бальшавіцкага забясьпячэньня вык

Шырэй хвалю бальшавіцкай самакрытыкі

З 20 ЛЮТАГА ПА 1 КРАСАВІКА ЦКК ПРАВОДЗІЦЬ ПРАВЕРКУ ВЫКАНАНЬНЯ ДЫРЭКТЫЎ ПАРТЫІ ПА РАЗГОРТВАНЬНІ САМАКРЫТЫКІ І ЎНУТРЫПАРТЫЙНАЙ І РАБОЧАЙ ДЭМАКРАТЫІ

Усе сілы на пасьпяховае правядзеньне праверкі

Праверым выкананьне дырэктыў партыі

Г. Гершман

ЦК УсеКП(б) у сваёй адозьве аб самакрытыцы падкрэсліў, што «лёзунг самакрытыкі, «яе гледзячы на асобы», крытыкі зьверху далёку і зьніву дзеверху—ёсьць адзін з цэнтральных лёзунгаў дня». Разам з гэтым партыя паказала на тое, што самакрытыка—адзін з важнейшых метадаў умацненьня рабочых мас у сацыялістычнае будаўніцтва, што «задачы рэканструкцыйнага перыяду ня могуць быць выкананы без самага сьмелага, самага рашучага, самага пасьлядоўнага ўмацненьня мас у справу сацыялістычнага будаўніцтва, праверці і кантролю з боку гэтых мільённых мас усяго апарату, яго аньшчэньня ад чужародных элементаў».

КП(б)Б, як адзін з аддалёк УсеКП(б), разам з усёй партыяй дабілася ґіганцкіх посьпехаў на ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва. КП(б)Б, пад кіраўніцтвам свайго ЦК, мабілізуючы рабочую клясу і шырокія калгасныя, батрацка-бядняцкія і серадняцкія масы вёскі ператварыла бальшавіцкага лёзунгу самакрытыкі, дабілася ґіганцкіх посьпехаў у ажыцьцяўленьні генэральнай лініі партыі. КП(б)Б, бальшэвікі выкрываючы скажэньні партыйнай лініі, канцэпцыі і канцэпцыі руйнуючыя ўдары па ўсіх праўдзівых правага апартунізму—галоўнай небясьпецэ на даным этапе, на ўсіх «лявацкіх» рэцыдывах і на правяраючае да ўхілаў ад бальшэвізму. У барацьбе за высокія тэмпы індустрыялізацыі і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, у ажыцьцяўленьні лёзунгу ліквідацыі кулацтва як класу на базе суцэльнай калектывізацыі самакрытыка выявілася магутным рэсэрвам змацаньня за выразнае правядзеньне партыйнай лініі. Імем па дакручы самакрытыкі, выкрата і разгромлена правыя, контрэвалюцыйныя беларускі нацыянал-дэмакратызм і яго агентура—нацыянал-апартуністы, імем дакручы самакрытыцы, КП(б)Б, пры дапамозе шырокіх пролетарскіх мас, выкрывае праўдзівы ідэалёгіцтва і бюракратызму.

Правыя і «левыя» апартуністы выступалі супроць пролетарскай самакрытыкі, яны рабілі ўсякія паклёпы на тэты бальшавіцкі лёзунг партыі. Апартуністы ўсіх колераў бацькавы самакрытыкі, бо яна выкрывае буржуазную сутнасьць іх тэорый. Разам з гэтым апартуністы ўсіх колераў імкнуцца, прыкрываючыся лёзунгам самакрытыкі, атакаваць генэральную лінію партыі і яе ленінскае кіраўніцтва—ЦК УсеКП(б).

16-ты зьезд УсеКП(б) канстатаваў, што «самакрытыка, як штодзенны арганічны метад партработы, не ва ўсіх арганізацыях належна разгорнута, яшчэ назіраюцца факты зацісну і скажэньня самакрытыкі». Зьезд падкрэсліў, што «з такога роду фактамі трэба весьці рашучую барацьбу, шырока разгортваючы бальшавіцкую самакрытыку для ўздыму ідэйнага ўзроўню і бальшавіцкага выхаваньня партыйных кадраў і партыйных мас, для выкрыцьця скажэньняў партыйнай лініі, апартунізму на практыцы і для далейшага разьвіцьця ўнутрыпартыйнай дэмакратыі».

Трэба з усёй катэгарычнасьцю сказаць, што гэта ацэнка, дадзеная 16-м партзьездам, ва ўсёй сваёй паўнаце адносіцца і да пасобных арганізацый, пасобных аддзелаў КП(б)Б. Што гэта іменна так, выразна сьведчаць факты прарыву на фронце разгортваньня самакрытыкі ў Барысаўскай, Віцебскай, Чарэйскай, Сеньковскай, Буда-Кашалёўскай, Сьвіслацкай і Жлобінскай партарганізацыях. Аб гэтым выразна сьведчыць рад фактаў, якія выкрылі Усебеларускія рэйды на праверцы рэагаваньня на рабселькораўскія допісы, на крытыку ў друку. Рэйдам выяўлена, што ў радзе фабрычна-заводзкіх партколектываў і нават раённых партарганізацый самакрытыка разгорнута слаба. Прычынай гэтаму зьяўляецца тое, што ў пасобных кіраўніцтвах была прыступлена бальшавіцкая ініцыятыва, што ў тых арганізацыях, дзе слаба разгорнута самакрытыка, былі праяўленьні правага апартунізму на практыцы, грубыя скажэньні партыйнай лініі на радзе адказных вучасткаў работы.

За бальшавіцкае разуменьне самакрытыкі

Усе факты і матар'ялы, зьвязаныя з зацісканьнем самакрытыкі, якія праходзілі праз ЦКК у 1929-30 годзе, паказалі, што далёка не ва ўсіх арганізацыях як належыць зразумелі значэньне самакрытыкі, як асноўнага метаду работы ўсіх арганізацый. Сям-там самакрытыку разумеюць, як часовую кампанію, якую варта толькі прапрацаваць на агульным сходзе і на гэтым скончыць (Дубровенскі раён). Адсюль, бязумоўна, мы маем такое становішча, што ў пасобных аддзеньнях партарганізацый няма постаяннай систематычнай работы па разгортваньні самакрытыкі. Гэта ведьмі выразна пацьвярджаецца на прыкладах акуляраай фабрыкі (Віцебск). Там ня была разгорнута самакрытыка, была праўдзена апартуністычная практыка з боку партарганізацый. Хвала самакрытыкі зьявілася толькі тады, калі там насьпеў сапраўдны ґвалт.

У радзе месц мы маем выпадкі, калі асобныя работнікі імкнуліся абмежаваць самакрытыку, чым стваралі магчымасьць апартуністам і бюракратам аказаць супраціўленьне разгортваньню самакрытыкі. Мы мелі рад фактаў, калі пасобныя наваг кіруючых работнікі, пагрозілі ад рабселькораў раней, чым пісаць у газэту, угаляць з імі матар'ялы, калі асобныя кіраўчыя работнікі крытыку сакратара ячэйкі, работніка РК і г. д. разглядалі, як падрыў партыйнага кіраўніцтва, і на аснове гэтага прад'явілі тым таварышом, якія крытыкуюць, розныя абвінавачаньні. Усе рабселькораўскія справы, якія праходзілі праз ЦКК (а іх было нямала), характэрны тым, што супроць актыўных рабкораў дупцьцелямі самакрытыкі фальсыфікаваліся розныя справы з мэтай дыскрэдытаваць рабселькораў. Некаторых рабселькораў за самакрытыку прабавалі абвінаваціць у чубараўшчыне, хуліганстве, дыскрэдытацыі партыйнага кіраўніцтва, супраціўленьні калектывізацыі і г. д. Душыцелі самакрытыкі мэтад шальмаваньня рабселькораў практыкавалі, як адзін з ленінных у змаганьні супроць бальшавіцкай самакрытыкі. Тлушчэлі самакрытыкі ў адказ на той ці іншы допіс у друку намест таго, каб на яго неадкладна рэагаваць, пачынаюць з рабселькора, капаюць і шукаюць—хто аўтар допісу і ці няма ў яго якіх-небудзь недахопаў. І калі зачэпка, хоць самая нязначная, знайшлася, дык пытаньне аб допісе ператвараюць у пытаньне аб рабселькору і гэтым змазваюцца значэньне тых фактаў, якія выкрыты карэспандэнцкім.

Складсці ўмовы для разгортваньня жорсткай крытыкі

Апрача выразнага разуменьня таго, што самакрытыка зьяўляецца асноўным метадам работы партыйных, прафсаюзных і савецкіх арганізацый, трэба дабіцца і поўнага забесьпячэньня ў рабоце гэтых органаў належных спрыяючых умоў для разгортваньня самакрытыкі. У адозьве ЦК УсеКП(б) аб самакрытыцы ёсьць такі пункт: «Толькі пасьлядоўна праведзеная ўнутрыпартыйная і прафсаюзная дэмакратыя, сапраўдная выбарнасьць партыйных і прафсаюзных органаў, поўная магчымасьць вымяшчэньня любога сакратара, любога бюро камітэту і г. д. створаць пастаянны кантроль мас, змогуць зьняць бюракратычныя нарасты і зьняць чыдь магчымыя праяўленьні бюракратычнага запіску, кампанейская «круговой парукі», чыноўніцкая дагоднасьці, самадурства, забываньня інтарэсаў мас і мяшчанскай супакоенасьці. Бяз гэтых мерапрыемстваў лёзунг крытыкі і самакрытыкі ператворыцца ў папяровую адпіску, якая толькі скампрамэтуе ў вачох мас і гэты лёзунг, і кіраўніцтва партыі, і самую партыю».

Цэлы рад фактаў з Чарэйскага, Барысаўскага, Буда-Кашалёўскага і інш. раёнаў сьведчаць аб тым, што гэтыя асноўныя ўмовы часамі трубя парушаюцца, што замест ушчэньня шырокіх партыйных і рабочых мас і неіраваньня іх актыўнасьці і творчага энтузіязму на выкананьне задач сацыялістычнага будаўніцтва праяўляецца адміністраваньне, ігнараваньне ініцыятывы і г. д. Асабліва трэба падкрэсьліць, што ў радзе выпадкаў труба парушаецца дырэктыва 16-ай партканфэрэнцыі аб немагчымасьці скарыстаньня на адказнай рабоце тых работнікаў, якія скампрамэтавалі сябе на рабоце. Для таго, каб крытыка не ператварылася ў гаварыльню, трэба забясьпечыць своечасовае рэагаваньне на самакрытыку і рэалізацыю прапаноў, якія ўносяцца масамі. Рад фактаў сьведчыць аб тым, што на пасобных вучастках у тых адносінах справа ня вэсім добрая. Трэба рашуча ўзмацніць змаганьне супроць тлушыцелаў самакрытыкі, за яшчэ больш шырокае разгортваньне работы па ажыцьцяўленьні сялвога лёзунгу бальшавіцкай партыі.

Быць на чале, кіраваць разгортваньнем самакрытыкі

Абастрэньне клясавага змаганьня, узмоцненае наступленьне сацыялізму па ўсім фронце ставіць задачу — рашучым чынам узмацніць кіраўніцтва справай разгортваньня самакрытыкі, узьняць на яшчэ больш высокую ступень арганізуючую ролю партыйных ячэек і райкомаў у разгортваньні жорсткай пролетарскай крытыкі і самакрытыкі. Партыйныя арганізацыі павінны пакіраваць агонь самакрытыкі на слабыя месцы ў сваёй рабоце. Клясава-варожыя элементы, шкодніцкі, бюракраты і апартуністы ўсіх колераў імкнуцца скарыстаць самакрытыку ў сваіх клясавых інтарэсах. Таму рашуча павінна быць узмоцнена барацьба «як з бюракратычнымі спробамі абмежаваньня самакрытыкі, так і з недапушчальнымі перахліствамі ў галіне самакрытыкі, якія даюць магчымасьць клясава-варожым элемэнтам скарыстаць самакрытыку супроць партыі і дыктатуры пролетарыяту» (з пастановы лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б), 1929 г.).

Вострасьць пролетарскай самакрытыкі павінна быць пакіравана на змаганьне за выразнае правядзеньне генэральнай лініі партыі ў практычнай рабоце. Партыйныя камітэты павінны падхапіць самакрытыку знізу і накіроўваць яе на пасьпяховае выкананьне палітычна-гаспадарчых задач, бо ўсякае тармажэньне ў разгортваньні самакрытыкі дае магчымасьць кулацкім элементам скарыстоўваць самакрытыку ў сваіх, варожых цэлях, інтарэсах.

«Толькі тое партыйнае кіраўніцтва аказваецца ў даных умовах на вышыні сваіх задач, якое сьмела і сьвядома праводзіць на практыцы лёзунг самакрытыкі, якое расьце ў змаганьні з недахопамі, у перамаганьні коснасьці і бюракратызму ў нашых арганізацыях» (Молатаў).

Задачы праверкі

З 20 лютага па 1 красавіка ЦКК КП(б)Б праводзіць шырокую праверку выкананьня дырэктыў партыі аб самакрытыцы, аб разгортваньні ўнутрыпартыйнай і рабочай дэмакратыі. Вакол гэтай праверкі трэба мабілізаваць увагу ўсёй КП(б)Б, рабочых мас, саветаў, прафсаюзаў, камсамолу, рабселькораў і партыйна-савецкага друку. Праверка павінна ўнесьці рашучы пералом у справу далейшага разгортваньня пролетарскай самакрытыкі.

У часе праверкі павінна быць прааналізавана, як разгорнута самакрытыка, «ня гледзячы на асобы», у напрамку сьмелага выяўленьня недахопаў праз насьценныя газэты, праз друк, праз масавыя сходы, наколькі ў рабоце ўсіх арганізацый рашуча ўжываюцца мерапрыемствы на хуткім рэагаваньні на прапановы, што ўносяцца друкам і масавымі сходамі. Таксама павінна быць дэтальна праверана, наколькі партыйныя арганізацыі вядуць змаганьне з фактамі заціску самакрытыкі. У гэтых адносінах асабліва павінна быць выяўлена роля друку, органаў КК-РСІ, партыйных камітэтаў, парт'ячэек, прафсаюзаў, органаў і пракуратуры.

Трэба праверыць, як ажыцьцяўляецца ўнутрыпартыйная дэмакратыя, на падставе шырокага разгортваньня самакрытыкі ва ўсёй рабоце партыйных і прафсаюзных органаў, наколькі захоўваецца выбарнасьць, як выконваюцца пастановы і прапановы рабочых мас. Разам з гэтым, трэба шырока праверыць, як ажыцьцяўляецца дырэктывы 16-ай парт канфэрэнцыі аб немагчымасьці скарыстаньня на адказнай рабоце тых работнікаў, якія сябе скампрэматавалі на рабоце, як скарыстоўваецца нізавымі партыйнымі і прафсаюзнымі арганізацыямі права ажкліканьня тых членаў выбарных органаў, якія (члены) не апраўдалі сябе на рабоце.

Ня меншая ўвага пры праверцы павінна быць аддана вывучэньню становішча рабселькораў, кіраўніцтва імі в боку рэдакцый газэт і партыйных органаў, наколькі сярод рабселькораў разгорнута выхаваўчая работа на аснове мэтаду сацыябарніцтва і ўдарніцтва.

Нарэшце, трэба праверыць пастаноўку растлумачальнай і выхаваўчай работы партыйнымі і прафсаюзнымі органамі сярод працоўных мас аб значэньні самакрытыкі, уцягваньні актыўнасьць гэтых мас на разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі на ўсёй рабоце.

Посьпех праверкі залежыць ад таго, наколькі ў яе будуць уцягнуты шырокія партыйныя, рабочыя, калгасныя і рабселькораўскія масы. Трэба зарас-на стварыць абсьледчыя брыгады, правесьці масавыя сходы рабочых, партыйнага актыву, камсамолу, рабселькораў, уключыць у работу па абсьледваньні партыйныя аддзелы ўсіх цэнтральных і раённых газэт і ўвесь нізавы друк.

Праверка павінна зьявіцца мадутным фактарам яшчэ большай мабілізацыі шырокіх партыйных мас рабочых, калгасьнікаў і батрацка-серадняцкіх мас на разгортваньне самакрытыкі, на пасьпяховае ажыцьцяўленьне базавой праграмы трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Самакрытыка ня стала мэтадам

змаганьня за выкананьне палітычна-гаспадарчых задач

Абсьледваньне Уваравіцкай партыйнай арганізацыі, якое было праведзена на падставе пастановы прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б у сувязі з праверкай выкананьня дырэктыў партыі аб самакрытыцы, паказала, што райком па працягу вэсьняга году і райКК за ўвесь час свайго існаваньня амаль што не займаліся пытаньнямі разгортваньня самакрытыкі, ня гледзячы на асобы.

Самакрытыка ва Уваравіцкай партарганізацыі яшчэ ня стала штодзенным метадам у рабоце кожнай партыйнай ячэйкі і кожнага партыйца пасобку. Самі кіраўнікі Уваравіцкай партыйнай арганізацыі заяўляюць, што «крытыка ў нас ёсьць, але самакрытыкі няма».

Што-ж гэта за так званая «крытыка», аб якой гаворыць кіраўнікі Уваравіцкай партыйнай арганізацыі? Вусім ясны адказ на гэта пытаньне даюць тыя факты, якія выяўлены ў часе абсьледваньня.

Дь сёньняшняга дня ні адно з заданьняў па загатоўках ня выканана. Недавыканана заданьне па загатоўках салома на 50 проц., а сена — на 75 проц. Ня гледзячы на цьвёрдую дырэктыву аб давядзеньні ў красавіку загатовак мяса ні менш, чым да 70 проц. гадавога заданьня, мы на 12 лютага маем выкананьне па гэтым заданьні толькі на 24 проц.

Райком вынес пастанову аб роспуску старога праваапартуністычнага кіраўніцтва райкаапсаюзу на чале з членам партыі тав. Панчэнка, але далей гэтага мерапрыемства не пайшоў. Апартуністы па мясазагатоўках на месцах, у сельсаветах яшчэ засталіся не закрантымі.

Яшчэ горшае становішча ў справе падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі і з разгортваньнем калектывізацыі.

На 12 лютага калектывізацыя па ўсім раёне дасягнула толькі 14 проц. (прырост на 0,9 проц.). Ніякай падрыхтоўчай работы да веснавой пасеўнай кампаніі не вядзецца. Ніхто яшчэ ня ведае, якія ёсьць у раёне запасы насеньня і якая колькасьць патрэбна для пасьпяховага выкананьня кантрольных лічбаў на 1931 год. Больш таго, абмяркоўваючы гэтыя лічбы (вызначэньня Наркамзэмаў), бюро райкому на чале з тав. Гольдзіным прыняло наскрозь апартуністычную пастанову аб скарачэньні пасеўнай плошчы ў раёне на 7.000 гэкт.

Яшчэ ў мінулым годзе ў саўгасе Уваравічы павінны былі быць скончаны тры будынкі для буйной рагатай жывёлы пад малочную ферму, адзін гараж, адна майстэрня сярэдняга рамонту і адзін 2-павярховы дом, вызначаны для рабочых кватэр. На саўгасе Старая Беліца павінна было быць пабудавана 7 сьвінарнікаў і 3 сілосныя вежы. Усе гэтыя аб'екты ня толькі ня скончаны, але значная частка іх яшчэ не распачата. Такія-ж прарывы ў будаўніцтве ёсьць і па калгасах. Раённае кіраўніцтва гэтыя прарывы хоча апраўдаць аб'ектыўнымі прычынамі. Расьсьледваньне паказала, што справа не ў аб'ектыўных прычынах, а галоўным чынам у тым, што на будаўніцтве ва Уваравіцкім раёне ёсьць цэлы рад нездаровых зьяніч. Сярод рабочых будаўнікоў зусім адсутнічае якан-б там ні было культурна-выхаваўчая работа ня толькі з боку рабачкомаў, але і з боку партыйных ячэек. На будаўніцтве у саўгасе Уваравічы на працягу доўгага часу панавае пэўны запіс самакрытыкі. Калі рабочыя будаўнікі пажадалі выпусьціць сваю насьценную газэту, старшыня рабачкому, член партыі, тав. Марчанка, зьняты ў свой час з работы ў райкаапсаюзе за апартуністычную практыку, намест таго, каб падтрымаць гэту ініцыятыву, забараніў рабочым выпускаць насьценную газэту.

Амаль такое-ж становішча мы маем на будаўніцтве ў саўгасе Старая Беліца. Яшчэ ў кастрычніку мінулага году паводле выводаў інспэктара ЦКК-НК РСІ павінен быў быць расьпушчан за праваапартуністычную практыку і запіск самакрытыкі рабочком саўгасу на чале з тав. Юхнівічам. Але з таго часу прайшло ўжо палі 5 месяцаў, а гэта зусім правільная пастанова яшчэ ня выканана.

Пры наяўнасьці такіх прарываў у рабоце кіраўніцтва партыйнай арганізацыі рабочая газэта «Калектывіст» намест таго, каб па-бальшавіцку, ня гледзячы на асобы, выкрыць усе гэтыя нездаровыя зьявішчы, займаецца мізэрнымі разважаньнямі. Больш таго, газэта «Калектывіст» на працягу свайго існаваньня не знайшла патрэбным вымяшчаць ні аднаго артыкулу аб барацьбе з правым ухілам у тэорыі і асабліва па практыцы. «Калектывіст» ня толькі не арганізаваў і не мабілізаваў усю партыйную масу і прапоўнае насельніцтва раёну на выкананьне палітычна-гаспадарчых задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі, але ён нават не асьвятляў ходу тых кампаній, якія праводзіліся ў раёне.

На сходах ячэек на рабочым актыве і нават на насяджэньні бюро райкому было рад выступленьняў нікопт прарываў, якія меліся ў раёне. Але ўсім рэдка былі чутны такія выступленьні, якія-б канкрэтна расказалі-б, хто пінаваты ў гэтых прарывах.

Такое становішча ў пытаньнях самакрытыкі на Уваравіцкім вусім непыпадковае. На працягу ўсяго году райком ні аднаго разу не пастаўіў пытаньня аб становішчы самакрытыкі ў раёне, за ўвесь гэты час ня было ні аднаго рабселькораўскага сходу, не гаворачы ўжо аб тым, што ніхто ў раёне не вядзе ўліку рабселькораў.

Пры такім кіраўніцтве самакрытыкай вусім ня дзіўна, што ў покаторых выпадках самакрытыка пакіроўваецца не на выкрыцьцё недахопаў і не на зьяўшчэньне іх, а на кампрэмэтацыю партыйна-савецкіх органаў у цэлым. Вось прыклад: ЦК і ЦКК КП(б)В пасьля ліквідацыі акруг пакінулі ў кожным раёне стварыць органы КК-РСІ, каб з большым посьпехам выкаціць супроць усякіх права- і «лева»-апартуністычных і бюракратычна - шкодніцкіх скажэньняў у нашым будаўніцтве. Каб гэтыя органы КК-РСІ змаглі ў гэтую барацьбу ўцягнуць усю партыйную, рабселькораўскую, калгасную, батрацка-бядняцкую і серадняцкую масу, ЦКК вызначыла для кожнага раёну штаты в 4-х адзінак. «Калектывіст» у першым-жа нумары выступае супроць увядзеньня ў райКК-РСІ штату з 4-х адзінак, абвінавачваючы райКК-РСІ ў тым, што яна на падставе ўвядзеньня гэтых штатаў зьяўляецца «посьбітам бюракратызму».

Кваліфікуючы гэта выступленьне газэты, як паклёп на работу райКК-РСІ, старшыня райКК тав. Хайтовіч пераніс выразнае гэтага пытаньня на аб'яднанае пасяджэньне бюро РК і праэзыдыуму РКК. І замест таго, каб па-бальшавіцку асудзіць гэтае няправільнае выступленьне газэты на адрасе райКК, бюро райкому ў сваёй пастанове «ня бачыць» у вымяшчэньні ў газэце гэтага паклёпу на работу райКК-РСІ палітычнай памылкі.

Другі факт няправільнага разуменьня самакрытыкі: паводле вынікаў абсьледваньня бюро Уваравіцкага райкому разам з праэзыдыумам райКК пастанавілі: «За поўную бальшэвізацыю і адсутнасьць усякай партыйнай і прафесыянальнай работы сярод будаўнікоў распусьціць бюро партыйнай ячэйкі і рабочком саўгасу Уваравічы, абвясьціўшы суровую вымову сакратару партыйнай ячэйкі тав. Якаўцаву і старшыні рабочкому тав. Марчанку». Але на гэтым-жа насяджэньні бюро РК пастанаўляе гэта-ж Якаўцава накіраваць на вучобу па Усебеларускую партыйную школу.

Яшчэ ў красавіку мінулага году прэзыдыум ЦКК разам з рэдакцыяй газэты «Зьвязда» праводзілі Усебеларускі рабселькораўскі рэйд па рэагаваньні на рабселькораўскія заметкі. У выніку гэтага рэйду рад партыйцаў — гаспадарнікаў і кіраўнікоў прафесыянальных і грамадзкіх арганізацый былі прыцягнуты ЦКК і райКК на месцах да адказнасьці за праўдзівае правага ўхілу на практыцы.

Гэты ўрок ня быў учвчан Уваравіцкай партыйнай арганізацыяй.

Усё гэта з усёй выразнасьцю гаворыць аб тым, што ня гледзячы на рад адпаведных дырэктыў ЦК і ЦКК УсеКП(б) і КП(б)Б аб шчырым правядзеньні ў штодзённай рабоце генэральнага лёзунгу нашай партыі — самакрытыкі, мы ў радзе выпадкаў на гэтым фронце маем пякія прарывы якія зьяўляюцца вынікам праваапартуністычнай практыкі ў разгортваньні самакрытыкі.

Вось чаму вусім сьвяточасовай зьяўляецца праверка выкананьня дырэктыў партыі аб разгортваньні самакрытыкі, якая зараз праводзіцца прэзыдыумам ЦКК разам з бюро ЦК КП(б)Б.

С. Шок.

25-годзьдзе другога гомельскага пагрому

(1906 год)

У бурным гадзе рэвалюцыі 1905 году Гомель займаў не апошняе месца. Хвалі рэвалюцыі ўзьнімаліся надзвычай высока і далі сябе адчуваць...

Гомельскі пралетарыят, сярод якога вялі работу мясцовыя рэвалюцыйныя арганізацыі, яшчэ задоўга да 1905 году быў магутнай рэвалюцыйнай сілай. Яшчэ да 1905 г. гомельскія рабочыя ўступілі ў адкрыты бой з царскімі апрычнікамі. Яшчэ да 1905 г. гомельскія рабочыя запоўнілі царскія турмы і цытадэлі і «адпачывалі» у глухой тайзе далёкай і халоднай Сібіры.

Між іншым, цікава адзначыць, што, іспанаўшыя да часу ўзьнікненьня Бунду с.-д. арганізацыя ў Гомелі не зталіліся ўнайсці ў Бунд, матывуючы гэта адмоўленьне тым, што ня лічыць патрэбным стварэньне асобнай арганізацыі яўрэйскага пралетарыяту.

Бурны 1905 год у Гомелі быў годам адкрытых выступленьняў рабочых супроць царскага самаўладзтва, не гаворачы ўжо аб шматлікіх дробных забастоўках, давелі часта выходзячых з рамак эканамічнай барацьбы.

Першыя весткі аб падзеях 9 студзеня ў Пецярбурзе знайшлі ў Гомелі самы жывы водгук. Забастоўкамі, дэманстрацыямі адказалі гомельскія рабочыя на расстрэл піцерскіх рабочых.

Сакавіцкі гомельскі «роў», вядомая гомельская «біржа» узьнялі сябе ніпучыя каўпакі, дзе рэвалюцыйная думка перапляталася ў рэвалюцыйныя дзеяньні.

Усеагульная палітычная забастоўка жахкала і гарадзкіх і чыгуначных рабочых. Адкрыта на вуліцах адбываліся грандыёзныя мітынгі-сходы, якія прыцягвалі на векавы тысяч чалавек. Сутычкі з паліцыяй і жандармерыяй былі звычайным зьявішчам кожнага дня. Спробы крыцьку адбываліся натоўпамі рабочых.

Такім чынам, гомельскія рабочыя з высокай годнасьцю рэвалюцыянэрэў адгукнуліся на пецярбурскія падзеі 9 студзеня 1905 году.

Настрой рабочых Гомеля ўвесь час заставаўся ўзьнятым, рэвалюцыйным.

Не абыйшлося нідзема, і без ахвяр з боку рабочых. Так, праз некалькі дзён — 18 студзеня таго-ж 1905 году — у адпэй з сыноў у «рове» адбыўся чарговы сход хуўрэйскіх рабочых. Аб гэтым даведалася паліцыя, якая зараз-жа выслала на месца сходу атрад салдат, на чале са старшым паліцэйскім.

Рабочыя, дазведзўшыся аб набліжэньні салдат, пакінулі сход і пачалі разьбягацца, а крэўнік атраду — старшы гарадзны — адкрыў па іх стрэлкіну з рэвальвэра. Аднаразі палі маладая работніца Дворкіна і пералы рабочы Каганаў. Некаторыя аказаліся цяжка або лёгка параненымі.

Усё гэта яшчэ больш узмацнила банды настрой сярод рабочых. Паваяньне забітае рабочыцы ператварылася ў шырэнную дэманстрацыю. Трохтысячны натоўп суправаджаў труну, на якую была ўскладзена ўстужка з надпісам: «Ахвяры рускае рэвалюцыі ад гомельскага пралетарыяту». Ля адкрытай магілы выступалі прамоўцы ад Палескага с.-д. камітэту, заснавацелем і кіраўніком якога быў бальшавік тав. Уладзімераў, з Бунду.

Стройнымі радамі парочаліся рабочыя з шыхаваньня, праходзячы па галоўных вуліцах Гомеля. Цэлы тыдзень пасьля гэтага працягвалася забастоўка пратэсту, у якой удзельнічала да тысячы чалавек.

Так прайшоў увесь студзень месяц. Але не пасьпеў яшчэ ўвайсьці ў берагі студзеньскі рух, як да Гомелю дайшлі чуткі (якія потым аказаліся сапраўднымі) аб татара-армянскай разьні ў Баку.

Гомельскія рабочыя, якія паспрабавалі ўжо на сабе смак «нацыянальнае палітыкі» царскага самаўладзтва, у часе першага гомельскага пагрому у 1905 годзе былі надзвычай абураны Бакінскія падзеі выклікалі энэргічны пратэст у рабочых масах.

26-га лютага адбыўся шырокі адкрыты мітынг пратэсту. У ім удзельнічала каля 900 чал. Сход прыняў адпаведную рэзалюцыю пратэсту супроць самаўладзтва, якое карыстаецца такімі агідлівымі сродкамі барацьбы з рэвалюцыяй, як сяўнае нацыянальнай варожасьці і нацкоўваньне адной нацыі на другую.

У гэтай рэзалюцыі гомельскія рабочыя выказалі сваё ўзьнёнасьць, што армянскі пралетарыят, разам з пралетарыятам іншых нацыянальнасьцяй, адкажа новым рэвалюцыйным выбухам, які канчаткова зьнішчыць царска-чамешчыцкі строй і на руінах яго пабудуе брацкі саюз пралетараў усіх нацыянальнасьцяй.

Сакавік і красавік месяцы прынесьлі з сабою цэлы рад дробных і буйных эканамічных забастовак. Гомельскі рабочы ня мог ужо мірыцца са старымі ўмовамі працы. Выставалі рабочыя розных цэхаў, прыказчыкі, хатнія работніцы і інш. Амаль усе забастоўкі канчаліся перамогай рабочых.

З нябывалым посьпехам прайшло ў тым годзе майскае сьвята. Майскае сьвята ў Гомелі ўжо даўно ня было новым зьявішчам. У Гомелі яго пачалі сьвяткаваць яшчэ ў пачатку 90-х гадоў.

Тому натуральна тое асаблівае непрыняцьце, з якім рабочыя масы Гомелю чакалі выступленьня першамайскага дня 1905 году.

Наступіў чарэдзе доўгачаканы дзень 1 мая (18 красавіка па ст. стылі). У гэты дзень выставалі ўсе прадпрыемствы. З самае раніцы горад быў перапоўнен войскам, казакамі і паліцэйскімі. На пералічы на г-та. Кузьнечная вуліца («біржа») была напоўнена рабочымі, адпаўтымі па-сьвяточнаму, і работніцамі з чырвонымі істужкамі. На сьцяны дамоў, на платах былі наклеены першамайскія праклямацыі. Цэлы дзень вуліца ніпела народам. Адкрытых дэманстрацый у гэты дзень ня было, аднак, эфэкт адкрытага сьвяткаваньня атрымаўся вялізарны.

Жытомірскі пагром у маі таго-ж году выклікаў дошае абурэньне сярод гомельскіх рабочых. У знак пратэсту быў абвешчана ў горадзе адзнадзенная палітычная забастоўка. На «біржы» адбывалі вялізарны мітынг, на якім прысутнічаў Хлебнікаў, у яго кінулі бомбу, якая, аднак, не разарвалася.

Часова «біржа» разагнана. Паліцыя сьвяткавала перамогу... Але гомельскія рабочыя працягвалі і далей барацьбу за «біржу».

У верасьні таго-ж году выбухнула першая забастоўка ў гомельскіх чыгуначных майстэрнях, якая спынілася ў пачатку кастрычніка.

12 кастрычніка забастоўка зноў адновілася.

Забастоўка пагрозілася да славутага царскага маніфесту —17 кастрычніка. Па атрыманьні маніфэсту ў чыгуначных майстэрнях быў арганізаваны грандыёзны мітынг.

Весткі аб маніфэсьце аблецела ўвесь горад. Усё насельніцтва выйшла на вуліцы. Настрой быў узьняты.

Усюды адбываліся мітынгі, сходы. Выступалі прамоўцы ўсіх рэвалюцыйных арганізацый. Усе яны заклікалі рабочых — ня спыняцца на шляху, а працягваць барацьбу за поўнае выпаленьне ад арма ламеншчыкаў і капіталістаў.

В партыйных арганізацый па свазім ўплыве ў Гомелі ў перыяд уздыму рэвалюцыі трэба асобна адзначыць арганізацыю РСДРП і Бунду. Ідэйны напрамак Бунду, як гэта добра вядома, быў нацыяналістычны і апартуністычны. Але, пад націскам рэвалюцыйных падзей, якія разьвіваліся, і пад націскам рабочых-бундаўцаў, якія зьяўляліся найбольш рэвалюцыйнай бундаўскай арганізацыяй, апошняя прымала актыўны ўдзел у рэвалюцыйных выступленьнях паказанага перыяду. Што датычыць арганізацыі РСДРП, дык трэба асабліва падкрэсьліць ня вялікія заслугі ў барацьбе супроць нацыяналізацыі Бунду і работу на аб'яднаньні ўсіх рабочых без адрозьніваньня нацыянальнасьцяй у радох адной арганізацыі. Праўда, як розьніца ад іншых раённых арганізацый, у Гомельскай быў моцны меншэвіцкі напрамак, што не магло не знайсьці адбітку і ў праўдзівай апартунізму і ў арганізацыйным пытаньні і, у прыватнасьці, у прымірэнцтве да Бунду. Але, як ужо было сказана вышэй, група бальшавікоў з Палескага камітэту, які аб'ядноў рад с.-д. груп Палескага раёну, шмат дала для распаўсюджаньня ідэй бальшавізму ў гэтым раёне.

Сьвята гэта, аднак, працягвалася нядоўта. Памалу ня горадам, як і па ўсёй Расіі, панавісьлі чорныя хмары...

Замяніны царскі ўрад пачаў патрохі ачуньваць і напраўляць сваё мінулае становішча...

У Гомелі, як і ў шмат якіх гаралох, сталі арганізоўвацца розныя «патрыётычныя» саюзы, як саюз «истинно русских людей», саюз «русского народа», «Михаила Архангела» і інш. Усё гэта аьяўлялася апорай царскага трону. Іх мэта была кароткая і ясная—зьнішчаць ворагаў «цара і бацькаўшчыны» і ў першую чаргу—рэвалюцыйных рабочых.

Увесь гэты чорнасоценны апарат прыпадаўся ў рух для арганізацыі пагромаў і забойстваў. І пачалі яны пагром, вэбінаць мірнайскіх рабочых, мірнайскую беднату. Ад іх рукі гінулі сотні людзей, палалі гарады і мястэчкі. Іх крывавыя ўчынкі благаславіў крыж у руках «сьвятога». Пагромы гэтыя зьяўляліся ў руках контр-рэвалюцыі аружжам у грамадзянскай вайне для задушэньня рэвалюцыі і пераходу ў наступленьне для перамогі рэакцыі.

У Гомелі ў той час, упада фактычна перайшла ў рукі ўсіх гэтых чорнасоценных пагромшчыкаў, гэроў сукаватай дубінкі, на чале якіх стаяў «славуты Акім Давыдаў, расстраляны ў Гомелі ў студзені мінулага году, на прыгаворы Вярхоўнага суда БССР.

Пасьля азьвярэлых і шумных дзён «свабоды» горад крыху прытаіўся, стаў чакаць чагосьні... Да гораду ўвесь час даходзілі чуткі аб пагромах і крывавых зьвіваньнях мірнайскіх, якія адбываліся то тут, то там і аб падрыхтоўцы пагромаў там, дзе іх яшчэ ня было.

З дня на дзень чакаўся пагром і ў Гомелі, але яго пакуль ня было. Відавочна паліцыя і чорнасоценныя элементы сур'ёзна пабойваліся арганізаваных атрадаў рабочай самаабароны, як гэта было пры пагроме 1903 г. Затое нешта жудаснае адбывалася тады ў Рэчыцы: 23 кастрычніка Гомель атрымаў вестку аб пагроме, які пачаўся ў Рэчыцы. Гомельскія арганізацыі адправілі туды атрад самаабароны, які складаўся з 28 узброеных таварышоў.

А 3-й гадзіне таго-ж дня атрад прыбыў у Рэчыцу, але па дарозе са станцыі ў горад ён сутыкнуўся з засэўшымі ў вазу рэчыцкімі грамілямі, якія на аллеяласці каля 100 крокаў адкрылі па атрадзе страляніну. 6 чалавек адразу пала на месцы, 12 было

„ДАВОЛІ ЖЫЦЬ ПА-СТАРОМУ!“

У адказ на паход імпэрыялістаў супроць савецкай пяцігодкі—лепшыя прадстаўнікі аднаасобнікаў—беднякоў і сераднякоў Крычаўшчыны заклікаюць сялянскія масы:

„УСТУПАЙЦЕ У КАЛЁНУ БАЙЦОУ

ЗА ПЯЦІГОДКУ ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ, ЗА СУЦЭЛЬНУЮ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЮ І ЛІКВІДАЦЫЮ КУЛАЦТВА ЯК КЛЯСЫ“

„Ня можам далей жыць па-дзедаўску“

КРЫЧАЎ. (Наш кар.).

20 аднаасобнікаў беднякоў і сераднякоў—удзельнікаў 6 раённага зьезду саветаў—у адказ на паход імпэрыялістаў супроць савецкай пяцігодкі і вымыслы аб «прымусовай» працы ў СССР, уступілі ў калгасы і зьвярнуліся да усіх беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў Крычаўскага раёну з адезвай пасьледаваць іх прыкладу.

У гэтай адозьве, між іншым, гаворыцца:

«Будучы дэлегатамі на зьезьдзе саветаў, мы даведаліся, што пераважная частка калгасаў Крычаўшчыны ўжо за адзін год так эканамічна вырасла і ўмацавалася, што нам нават гэта і ня сьнілася. Ці можам мы далей заставацца жыць па-дзедаўску? Не, ня можам! Нам нават соромна было сказаць, што да гэтага часу мы яшчэ ня ўступілі ў калгас, што часам прыслухоўваліся да кулацкай антыкалгаснай агітацыі.

Даволі жыць па-старому! З сёньняшняга дня мы абвяшчаем сябе калгаснікамі і ўступаем у калёну байцоў за суцэльную калектывізацыю, за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады».

Дэлегаты калгаснага зьезду рэалізуюць адозву аб кантрактацыі

БАГУШЭЎСК. (Па тэлеграфу). **Зьезд калгаснікаў Багушэўшчыны** абвясьціў сябе мабілізаваным па рэалізацыю адозвы партыі і ўраду аб кантрактацыі яравых, арганізацыю новага калгаснага прыліву і выкананьне пляну загатовак. **Усе дэлегаты выехалі для гэтай мэты ў 17 пунктаў Багушэўскага раёну.**

ЗАЛЕСКІ.

„Новы шлях“ разгортвае падрыхтоўку

Калгас «Новы шлях», Сьмілавіцкага раёну, у сучасны момант яднае 54 гаспадаркі. Ён мае 30 коняй, 65 кароў, 15 сьвіньматак. Калгас пабудаваў у гэтым годзе два дамы. У бягучым годзе вызначана пабудова сьвінарніка на 100 сьвіньматак, аборы—на 50 штук, сталоўкі, дазьні, кузьні.

Сёлета будзе засеяна пад бульбу 115 гакт., пад авёс—75, ячмень—52, кораблоды—5 і пад іншыя культуры— 7 гакт.

Прыбытак за адзін год складае 48 тыс. р., але ў калгасе ёсьць і рад буйнейшых прарываў. На полі засталася нязубраная частка лубіну і сена. Гэта вынік таго, што ў калгас залез чужы элемэнт, які раскладае калгасную маемасьць, імкнецца яго разбурыць з сярэдзіны. Беднота ў калгасе не арганізавана, што значна палягчала шкодніцкай дзейнасьці. Сандагавор з калгасам «Савецкая Беларусь» ня выконваецца, ударніцтва не разгорнута.

Нядаўна адбыліся неравыбары праўленьня калгасу. Новаму праўленьню калгаснікі далі наказ неадкладна арганізаваць беднату, разгарнуць работу па ўцягненьні ў калгас аднаасобнікаў-беднякоў і сераднякоў, ліквідаваць безгаспадарчасьць, павесьці рашучую барацьбу з чужым элемэнтам, разгарнуць падрыхтоўку да сяўбы. Ужо праведзены 2 сходы калгаснікаў разам з аднаасобнікамі. **Сходы абвясьцілі сябе ўдарнымі па правядзеньні веснавой кампаніі.** Калгаснікі заключылі сандагавор з аднаасобнікамі. Калгас дапамагае апошнім трыерамі і рабочай сілай.

С. Б.

На хвалях апартуністычнага самацёку

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

З дакладу праўленьня райкалгассэкцыі і са спрэчак выступаўшых актывістаў калгаснікаў на Межынскім раённым зьезьдзе калгаснікаў з усёй выраз насьцю выявілася, што **райкалгассэкцыя ня справілася з пастаўленымі перад ёю партыяй задачамі.**

У сучасны момант на Межынскім раёне налічваецца 21 калгас, якія яднаюць 507 двароў, што складае **9,1 проц.** калектывізацыі. Раённыя арганізацыі яшчэ ня стаілі на чале калгаснага руху, не вялі належнай масавай работы сярод беднацкіх і сераднацкіх мас аднаасобнікаў. Стаўка на самацёк, асабліва з боку райкалгассэкцыі, недапушчала такіх важных пытаньняў, як арганізацыя працы ў калгасах, несвачасовае разьмеркаваньне ўраджаю, бесгаспадарчасьць у паасобных калгасах—усе гэтыя моманты перашкаджалі далейшаму разьвіцьцю калектывізацыі.

Кулацтва, вораг усімі спосабамі прабаваў сарваць мерапрыемствы па замацаваньні калгасаў і арганізацыі новага прыліву. Кулакі запалохвалі беднату, распускалі контр-рэвалюцыйныя чуткі, арганізоўвалі кулацкія сходы і нават тэрарыстычныя акты. Адзак, раённыя і нізавыя арганізацыі не далі належнага адпору кулаку, недастаткова мабілізавалі бяднацка-сераднацкія масы на барацьбу з клясавым ворагам. Кампаніі, якія праводзіліся на раёне, ня былі ўвязаны з арганізацыяй новага калгаснага прыліву. Вярбовачныя камісіі па калгасах і сельсаветах амаль не працуюць.

Адсутнасьць кіраўніцтва калгасным будаўніцтвам дала магчымасьць кулацкім элемэнтам пралезьці ў калгасы імя Калініна, «Беларусь», «Свабода», «Перамога», імя Ананскага і весьці там шкодніцкую работу. Праўда, за апошні час з калгасаў было вычышчана каля 17 кулакоў, але ў час чысткі калгасаў ад кулацкіх элемэнтаў не праводзілі пасьпешнай работы на ўцягненьні батракоў, беднякоў і сераднякоў у калгасы. Росту калектывізацыі перашкаджала і замкнутасьць некаторых калгасаў (напрыклад, «Адраджэньне», «Новае жыцьцё»).

Межынскі раён — ільнаводны раён, але спэцыялізацыя фактычна праводзіцца толькі на паперы.

Укамплектаваньне сьвінагадоўчых гаспадарак праходзіць дрэнна. Замест 200 сьвіньматак, ёсьць толькі 96, а на жывёлагадоўчых гаспадарках — замест 300 галоў — 173. Не выкарыстоўваюцца ўсе магчымасьці для стварэньня кармавой базы.

Арганізацыя працы ў калгасах не на вышыні. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва не разгорнута, працдысцыпліна ў занепадзе. Нявыхад на работу і нядбайныя адносіны да інвэнтару і жывёлы па некаторых калгасах увайшлі ў сыстэму. Вытворчыя нарады ў большасьці калгасаў не праводзяцца, разьмеркаваньне ўраджаю далёка ня ўсюды праведзена. Ёсьць калгасы, па якіх яшчэ не абмалочан ураджай.

Райкалгассэкцыя не аказала калгасам практычнай дапамогі ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, абмежавалася толькі насылкай пасеўных плянаў. Не ва ўсіх калгасах гэтыя пляны абгаварваліся. Некаторыя калгасы, як **«Свабода»**, Шаброўскага сельсавету, **скараціці пасеўную плошчу, асабліва па тэхнічных культурах.** Многія калгасы не забясьпечаны штучнымі ўгнаеньнямі, у той час, калі на ст. Бычыхі ў 30 клм. ад Межы ёсьць 12 вагонаў угнаеньня. С.-г. інвэнтар не рамонтуецца.

Раённы зьезд калгаснікаў прызнаў работу райкалгассэкцыі нездавальняючай і намеціў канкрэтныя мерапрыемствы па арганізацыі калгаснага прыліву і правядзеньні падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

Калгаснікі аднагалосна пастанавілі да 20 лютага апрацаваць увесь лён і здаць яго ў прыёмачныя пункты, а таксама ўзялі абавязак стварыць спэцыяльныя брыгады для правядзеньня загатовак ільну па індывідуальных гаспадарках.

Дэлегаты калгасу «КІМ» абвясьцілі сябе ўдарнікамі па правядзеньні веснавой сяўбы і выклікалі на сацспаборніцтва ўсіх калгаснікаў с.-г. арцелі «Чырвоны Кастрычнік».

Камсамольцы — дэлегаты зьезду таксама абвясьцілі сябе ўдарнікамі і ўзялі на сябе канкрэтныя абавязкі па падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі і ўцягненьні батрацка-бядняцкіх і сераднацкіх мас у калгасы.

7 дэлегатаў — старыя калгаснікі—падалі заявы аб прыёме іх у партыю.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.

Пачаўся прыліў

ГАРАДОК. (Па тэлеграфу). **Распачаўся прыліў у калгасы. На працягу другой пяцідзеўкі лютага па Гарадоцкім раёне арганізавалася 5 калгасаў і 2 пачатковыя вытворчыя аб'яднаньні.**

Брыгада «Зьвязды—ФАРБЭРАЎ.

Выкрылі кулакоў, арганізавалі калгас

АСІПАВІЧЫ. Да апошняга часу в. ЗАЯЛІЧА, ЗАМОСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, стаяла ў баку ад калектывізацыі. Кулацкія элемэнты і падкупачнікі падрывалі мерапрыемствы па сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі. Беднота ня была арганізавана.

Беднаце і сераднякам прышлі на дапамогу РАБОЧЫЯ ТОРФАІЗАЛЯЦЫЯНАГА ЗАВОДУ № 2. Яны дапамаглі вёсцы выкрыць кулакоў і іх шкодніцтвы. У АДКАЗ НА КУЛАЦКІЯ ВЫЛАЗКІ АРГАНІЗАВАЎСЯ КАЛГАС, ЯКІ АБ'ЯДНАЕ 18 БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК.

Г. С.

Разгарнуць кантрактацыю ільну і канапель у БССР

Аспоўным відам прадукцыі сельскай гаспадаркі, якая кантрактуецца ў 1931 годзе, ва ўмовах БССР будзе ільнавалакно, ільнасемя, ільнік і канопі. Гэтымі культурамі ў гэтым годзе ў БССР пачнецца быць засеяна 280 тыс. гакт., а іх закантрактавана 208 тыс. гакт. З 208 тыс. гектараў пасеваў тэхнічных культур, якія кантрактуюцца, авансавай кантрактацыяй будзе ахоплена 123 тыс. гакт. і 85 тыс. гакт.—безавансавай. Сродкаў у выглядзе авансаў кантрактантам будзе раздана 4.140 тыс. рублёў. Аванс на гектар ільнавалакна і ільнасемя для калгасаў устаноўлен у 32 руб., а для вытворчых таварыстваў і групавой кантрактацыі ў аднаасобным сэктары—22 рублі на гэктар. Па пяньцы з канопляні для калгасаў устаноўлен аванс 63 рублі на гэктар, а вытворчым таварыствам і аднаасобнаму сэктару—41 рубель на гэктар.

Авансы кантрактантам выдаюцца 40% у красавіку і маі, а 60% пасьля праверкі фактычнага пасеву закантрактаванай прадукцыі. Грашовыя авансы калгасам і бяднацкім гаспадаркам выдаюцца з 7 проц. гадавых, а сераднацкім гаспадаркам—з 10 проц. гадавых. Насеньне пасеўшчыкам будзе адпускацца па загатоўчых цэнах даных мясцовасьці з надбаўкай 15 проц.

Норма здачы ільну, пянькі і насеньня ўстаноўлена для калгасаў, вытворчых таварыстваў і аднаасобнага сэктару адпаведная, у наступных разьлорах у пропарцыйных адносінах да заданьня ўраджаю:

Па ільнавалакне, трэсьце і саломе—60 проц., па ільнасемі і каноплях—55 проц., па пяньцы і канапляной трэсьце 60 проц.

Купацкія гаспадаркі паводле цьвёрдых заданьняў сяўбы павінны будуць здаваць загатоўчым арганізацыям увесь ураджай ільну і пяньці, а таксама і насеньня, за выключэньнем той часткі насеньня, якая ім патрэбна будзе для сяўбы ў 1932 годзе.

Калгасам і бяднацка-сераднацкім гаспадаркам, якія закантрактавалі свае пасевы, забясьпечваецца першачарговы водпуск дэфіцытных прамтавараў—мануфактуры, гатовага адзеньня, абутку, скуры і іншых тавараў—у паралку нармальнага забясьпячэньня па ўстаноўленых танных дзяржаўных цэнах.

Вытворчыя крадыты і сродкі вытворчасьці па першапачатковай апрацоўцы ільну і канапель у першую чаргу адпускаюцца тым, якія закантрактавалі сваю прадукцыю.

Для стымулявання разьвіцьця тэхнічных культур і насьняховага правядзеньня кантрактацыі кантрактантам ільну і канапель адпускаецца за наяўны разьлік за кожны зданы цэнтнэр валакна калгасам 1,4 цэнтн. хлеба, а вытворчым таварыствам і аднаасобным гаспадаркам—1.15 цэнтн.

У ліх гэтай нормы выдачы хлеба да 1 мая будзе выдана калгасам 0,6 цэнтн., а аднаасобным гаспадаркам—0,4 цэнтн. на закантрактаваны гэктар ільну ці канапель. Рэшта хлеба выдаецца пасьля здачы закантрактаванай прадукцыі. Пасьля здачы кантрактантамі семя ільну і канапель выдаецца на кожны зданы цэнтнэр семя калгасам 7 кілёграм алею і 10 кгр. жмыху, а індывідуальным гаспадаркам—6,7 кгр. алею і 8 кгр. жмыху.

Калгасы і аднаасобныя бяднацка-сераднацкія гаспадаркі ільнаканаплаводчых раёнаў, пры ўмове засеву імі ня менш 10-15 проц. усёй сваёй пасеўнай плошчы ільном, або ня менш 5-7 проц. канопляні, пры абавязковым выкананьні імі кантрактацыйных дагавораў па здачы закантрактаванай прадукцыі, ВЫЗВАЛЯЮЦЦА ад звычайнай здачы збожжа ўраджаю 1931 году.

Кантрактацыя ільну і ільнасемя павінна быць праведзена па ўсіх калгасах БССР на 100 проц. пасеву, незалежна ад раёну іх знаходжаньня, прычым кантрактацыя ў іх праводзіцца авансавая. У аднаасобным сэктары і вытворчых таварыствах кантрактацыя ільну і насеньня праводзіцца ў ільнаводных раёнах на 85 проц. пасеву ў колькасьці 77.554 гакт., з іх авансавай кантрактацыі—20.636 гакт.

У раёнах неільнаводчага ільну ў вытворчых таварыствах і ў індывідуальным сэктары павінна быць закантрактавана 27.951 гакт. ільну, прычым уся гэта кантрактацыя павінна быць праведзена безавансава. Зусім выключан з кантрактацыі ільну і насеньня 31 раён на індывідуальным сэктары і вытворчых таварыствах, як раёны з нязначнай таварнасьцю і нязначнай плошчай пасеву ільну. Пасевы ільну калгасаў кантрактуюцца і ў гэтых раёнах.

З плошчы канапель у 18 тыс. гакт., якая кантрактуецца, 11.541 гектар кантрактуецца ў калгасах і 6.459 гакт.—у вытворчых таварыствах і аднаасобным сэктары. Кантрактацыя канапель у калгасах і ў аднаасобным сэктары праводзіцца авансавая. У кантрактацыі канапель з ільнаводчых раёнаў прымаюць удзел па лініі калгасаў 22 раёны з плошчай 3.510 гакт. і 6 раёнаў па лініі вытворчых таварыстваў з плошчай 2.156 гакт. Па лініі жывёлагадоўчых садова-гароднікіх раёнаў у кантрактацыі канапель павінны прымаць удзел 53 раёны на лініі калгасаў з плошчай 8.03 гакт. і па лініі вытворчых таварыстваў —4.303 гакт.

Вось кораткі плян і практычныя мерапрыемствы, вызначаныя ў галіне пашырэньня насеваў ільну і канапель кантрактацыі гэтых культур. Забясьпечэньне насеннага балянсу на лініі заводзу і загатовак насеннага матар'ялу ільну і канапель у межах заявак 92 раёнаў (ад 8 раёнаў няма насенных балянсаў) зусім здавальняючае, і насенныя рэсурсы, якія адпускаюцца Ільнацэнтрам, і мясцовыя загатоўкі ўжо поўнасьцю пакрываюць гэтыя заяўкі.

Такім чынам, аднадае аспоўная пагроза забясьпячэньня раёнаў насеньнем. Зараз галоўнае—гэта мабілізацыя грамадзкай думкі вакол пытаньняў кантрактацыі, давядзеньне пляну кантрактацыі да калгасу, вытворчага таварыства і да паасобных груп кантрактантаў. Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на масавую работу з беднотой і групамі беднаты, бяз іх удзелу ў рабоце па кантрактацыі могуць быць значныя прарывы. Адначасова з давядзеньнем пляну кантрактацыі да калгасу, вытворчага таварыства і груп кантрактантаў трэба давесьці цьвёрды заданьні пасеву кулацкім гаспадаркам памятаючы, што пастанова большасьці зьяўляецца абавязковай для меншасьці.

ЛАЦІС.

У БАРАЦЬБЕ НА ДВА ФРОНТЫ—

СУПРОЦЬ ВЯЛІКАДЗЯРЖАЎНАГА ШАВІНІЗМУ, ЯК ГАЛОЎНАЙ НЕБЯСЬПЕКІ, СУПРОЦЬ БЕЛАРУСКАГА КОНТРРЭВАЛЮЦЫЙНАГА НАЦЫЯНАЛ-ДЭМАКРАТЫЗМУ І ШАВІНІЗМАЎ ІНШЫХ КОЛЕРАЎ

настаўніцкія масы БССР пад кіраўніцтвам партыі змагаюцца за пабудову культуры нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесьце

Адсталая, прыгнечаная ў мінулым Мардовія ператвараецца ў разьвітую гаспадарча і культурна вобласьць

(З ліста да асьветнікаў Савецкай Беларусі)

Работнікі асьветы Мардоўскай аўтаномнай вобласьці шлюць гарачае бальшавіцкае прывітаньне таварышом па рабоце — асьветнікам Савецкай Беларусі ў асобе III-га Ўсебеларускага настаўніцкага зьезду.

— Наша Мардоўская вобласьць у эканамічных і культурных адносінах адсталая. Эканоміка вобласьці — сельска-гаспадарчая. Сема сельская гаспадарка таксама зьяўляецца адсталай. Да арганізацыі вобласьці ў межах яе пераважалі драўляная саха з мачальным падвоем і драўляная барана. Складаных сельска-гаспадарчых машын па вобласьці да апошняга часу амаль ня было. Малатарні, жнявяркі, сявяркі, напрыклад, налічваюцца проста адзінкамі.

У культурных адносінах мардва—самы адсталы народ з усіх суседніх з намі брацкіх працоўных мас (чуваш, татары і г. д.). Процант пісьменнасьці мардвы — 29,9.

Прычына вялікай адсталасьці мардвы ў тым, што царскі ўрад трымаў мардоўскую нацыянальнасьць, як і іншыя нацыянальнасьці былой Расійскай імпэрыі, у цемры і невуцтве. Сярод гэтага народу царскім уладам праводзілася русыфікатарская палітыка. Замест школ і больніц будавалася шмат цэркваў і манастыроў.

Толькі Кастрычніцкая рэвалюцыя паклала канец прыгнечанню ўсіх нацыянальных меншасьцяй, і працоўная мардва атрымала сваё роўнаправе. Камуністычная партыя і савецкая ўлада зусім правільна разьвязана і разьвязваецца задача правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Дзякуючы гэтаму, Мардоўская вобласьць мае значныя посьпехі.

На 1-га лютага больш 12 проц. сялянскіх гаспадарак ахоплена калгасным сэктарам. Мы мяркуем у гэтым годзе арганізаваць 11 МТС. Да вясны 1931 г. арганізуем на сваёй тэрыторыі саўгасны сэктар у 125 тыс. гакт. Мы ўкладваем у сельскую гаспадарку 28-30 мін. руб. замест 8 млн. у мінулым годзе.

Летась наш калгасны сэктар кінуў старажытную драўляную саху і барану.

У бягучым годзе мы пазнаёмім ахоп калгасным сэктарам 65 проц. сялянскіх гаспадарак, а ў 1932 г. дабіваемся суцэльнай калектывізацыі Мардоўскай вобласьці. Мы прыступаем да пабудовы раду цагелень, лесапільных, чарапічных заводаў, вашпавага і трапальнага камбінату, рамонтна-механічнага і фасфарытнага заводаў і раённай электрастанцыі.

Пашырэньнем прамысловых прадпрыемстваў мы створым свой прамысловы нацыянальны пралетарыят.

У 1930-31 г. г. наша вобласьць з дапамогай краю здолела перайсьці на ўсеагульнае абавязковае навучаньне. На 1 студзеня сярэдні ахоп дзіцей школаю першай ступені складае 97 проц. Пераход на ўсеагульнае навучаньне зьявіўся значным дасягненьнем у галіне культурнай рэвалюцыі на сяле.

За час існаваньня Мардоўскай вобласьці (2 гады) адкрыт рад новых навучальных устаноў. Вялізарная справай палітычнай важнасьці зьявілася для нас работа па ажыцьцяўленьні сацыяльнай ліквідацыі нянісьменнасьці Мардовіі. Труднасьці ў ажыцьцяўленьні гэтай работы мы мелі і маем вялікія. Але ўсё-ж такі да цяперашняга часу мы здолелі, дзякуючы мабілізацыі ўсёй грамадзкасьці, ахапіць 64 проц. нянісьменных.

Цьвёрдай, упартай працай на грунце сацыялістычнага спаборніцтва і яго вышэйшых форм мы ператвараем культурна-адсталую Мардовію ў вобласьць гаспадарча і культурна разьвітую.

У асобе вас, брацкай арганізацыі асьветнікаў Савецкай Беларусі, як больш разьвітой краіны, мы спадзяемся мець вялікага памочніка ў нашай рабоце. Ваш вопыт будзе прыкладам для нашай гаспадарчай і культурнай работы.

Няхай жывуць брацкія сувязі Савецкай Беларусі з чырвонай Мардовіяй!

Няхай жыве камуністычная партыя — кіраўнік нацменшасьцяй СССР.

Па даручэньні прэзыдыуму абласнога аддзелу саюзу працасьветы Мардовіі — ІВАНОЎСКІ.

Настаўніцтва БССР узнагароджана ордэнам чырвонага працоўнага сьцягу

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР

Адзначаючы вялізарныя заслугі настаўніцтва БССР у справе барацьбы савецкай улады і камуністычнай партыі за ліквідацыю нянісьменнасьці сярод дарослых і ў справе правядзеньня ўсеагульнага навучаньня, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР пастанаўляе:

УЗНАГАРОДЗІЦЬ настаўніцтва БССР у асобе «САЮЗУ АСЬВЕТНІКАЎ» ОРДЭНАМ ЧЫРВОНАГА ПРАЦОЎНАГА СЬЦЯГУ.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

18 лютага 1931 г.

Настаўніцкі зьезд. Прадстаўнікі нацыянальных рэспублік і абласьцей знаёмяцца з беларускай літаратурай

З трыбуны зьезду

Вечарнае пасяджэньне 17 лютага пачалося дакладам тав. **Рубенчыка** аб удзеле камсамолу ў культурным будаўніцтве.

Пасьля гэтага дакладу з прывітаньнем ад імя ленінградзкай арганізацыі работнікаў асьветы выступіў тав. **Ваўчанін.**

— **Да 1 мая 1931 г.,**—заазначыў тав. Ваўчанін, — намі будзе канчаткова ліквідавана нянісьменнасьць у Ленінградзкай вобласьці. Мы павучым астатнія 200 тысяч нянісьменных. Сямігодак было ў нас летась 35, а цяпер сетка іх даведзена да 909.

Мы выканалі плян пасылкі асьветнікаў у раёны і гарады. Нам было дана заданьне выслаць 600 чалавек. Мы паслалі 603. У апошнія часы арганізаваны курсы для перападрыхтоўкі асьветніцкіх кадраў, праз якія мяркуецца прапусьціць 16.850 чалавек.

Ад імя маскоўскага настаўніцтва зьезд вітаў тав. Лашкевіч.

— Дазвольце мне, — сказаў тав. Лашкевіч, — перадаць вам, таварышы, гарачае прывітаньне ад 150-тысячнай армії асьветнікаў гор. Масквы і Маскоўскай вобласьці.

Падводзячы вынікі культэстафэты, мы, маскоўскія асьветнікі, павінны сказаць, што, дзякуючы імэнна культэстафэце, нам удалося разгарнуць шырока сацыялістычнае спаборніцтва. Культэстафэта дала бальшавіцкія тэмпы ў рабоце, прывяла да стварэньня 100-тысячнай армії культармейцаў. Знойдзены новыя формы навучаньня культармії; кожны раён Масквы мае свой культармейскі універсытэт.

Мне даручана ўсё капітоўнае ў нашым вопыце перавесьці ў нашу арганізацыю.

Тав. **Бараноўскі** вітаў зьезд ад імя **№**-скай Самарскай дывізіі.

З адказным словам ад імя зьезду выступіў тав. **Шыёнаў.**

Далей старшыня прадастаўіў слова для дакладу старшыні ЦК саюзу працасьветы, тав. **Рычкову.**

Жаваючых выступіць у спрэчках па дакладах т.т. Платуна, Рубенчыка і Рычкова запісалася 106 асоб

На вечарнім пасяджэньні змаглі выказацца толькі старшыня Белкалгасцэнтру тав. **Міцькоў** і начальнік палітаддзелу **№**-скай кавбрыгады тав. **Крупявецкі.**

***

На ранішнім пасяджэньні 18 лютага працягваліся спрэчкі па дакладах т. т. Платуна, Рычкова і Рубенчыка.

У спрэчках выступіла 45 дэлегатаў.

Выступаючыя ў сваіх прамовах падкрэсьлівалі тыя вялізарныя дасягненьні, якія мае БССР пад кіраўніцтвам сваёй КП(б)Б. Пад агонь бальшавіцкай самакрытыкі браліся ўсе нашы недахопы.

Ні адна з капіталістычных краін ня здольна так шпарка разьвіваць і гаспадарчае і культурнае будаўніцтва. Толькі краіна Саветаў, пад кіраўніцтвам партыі Леніна, правільна разьвязваючы ленінскую нацыянальную палітыку, змагла дабіцца такіх посьпехаў.

У спрэчках выступалі наркамзем т. **Рачыцкі** і т. **Бятуга.**

З ваўтарагадзінная прамовай выступіў старшыня СНК БССР. Бурнымі воплескамі, якія перайшлі ў авацыю, сустрэў зьезд т. Галадзеда.

У сваёй прамове т. Галадзед падрабязна спыніўся на тых сацыяльна-эканамічных арухах, якія адбыліся за апошнія гады ў СССР і БССР. Тав. Галадзед звярнуў увагу зьезду на задачы настаўніцтва ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Значную частку сваёй прамовы т. Галадзед прысьвяціў пытаньням барацьбы з вялікадзяржаўным расійскім шавінізмам, нацдэмакратызмам і шавінізмамі розных колераў. Нацдэмакраты—агенты польскага фашызму—хацелі вярнуць свае дарэвалюцыйныя прывілеі затапіць Беларусь сацыялістычную крыві рабочых і калгаска-бяднацка-сераднацкіх мас.

— У мэтах выкананьня сваіх пляноў нацдэмы прабавалі адарваць настаўніцтва ад сацыялістычнага будаўніцтва. Але ўсе гэтыя спробы разьбіты дашчэнту. Асноўная маса настаўніцтва ідзе нага ў нагу з партыяй і, у адказ на дзейнасьць контр-рэвалюцыйных нацдэмаў, яшчэ шчыльней згуртоўваецца вакол партыі Леніна.

Разам з гэтым сярод настаўніцтва ёсьць і такія, якія спачуваюць контр-рэвалюцыйным нацдэмам і іншым шавіністам. Трэба з усёй рашучасьцю абвясьціць безьлітасную барацьбу з такімі настаўнікамі. Прыняць усе захады да таго, каб ачысьціць настаўніцкія рады ад клясава-варожых элемэнтаў, а рэшткаў нацдэмаў і шавіністаў усіх колераў, якія працуюць нарушыць алінія ства рабочае клясы ў барацьбе за сацыялістычную рэканструкцыю народнай гаспадаркі, за канчатковую перамогу сацыялізму.

Па прапанове Рагачэўскай арганізацыі тав. Галадзед абіраецца ганаровым настаўнікам.

Зьезд абвяшчае сябе ўдарным імгрэцца году пяцігодкі на ператварэньне ў жыцьцё сваіх пастаноў.

***

Пад гукі аркестру стройнымі радамі ўзьмяцаецца на трыбуну дэлегацыя менскіх асьветнікаў і вучняў. Ад імя дэлегацыі зьезд вітае т. Науменка.

— Асьветнікі г. Менску пад кіраўніцтвам партыі дабіліся значных посьпехаў у галіне барацьбы за культурную рэвалюцыю,—кажа тав. Науменка.

— Культманўрамі мы дабіліся 100 проц. ахопу дзяцей школамі. Зьнішчылі перашкоды на шляху ўсеагульнага навучаньня. Поўнасьцю ахапілі дарослых лікпунктамі. Дабіліся паляпшэньня дашкольнага выхаваньня і г. д.

Фінцы, які адбыўся 22 студзеня наказаў, што яшчэ ня ўсё магчымае і патрэбнае зроблена менскімі асьветнікамі.

Папярэднія вынікі калдагаворнай кампаніі

Выключныя посьпехі ў сацыялістычным будаўніцтве, дасягнутыя за апошнія два гады, далі магчымасьць яшчэ больш узмацніць тэмпы сацыялістычнага наступленьня ў бягучым годзе. Траці год пяцігодкі зьяўляецца рашаючым у справе ажыцьцяўленьня лозунгу «Пяцігодка — за чатыры гады». Складзены ў адпаведнасьці з дырэктывамі XVI партзьезду народна-гаспадарчы плян, зьяўляючыся зусім рэальным, натрабуе, адпаў, значнага памаганьня ўсіх сіл партыі, прафэсыянальных і гаспадарчых арганізацый, рабочае класы і ўсіх працоўных.

Адным з магутнейшых фактараў мабілізацыі ўвагі рабочае класы на выкананьне задач трэцяга году, бязумоўна, зьяўляецца калдагаворная кампанія, якая — ва ўмовах перабудовы прафработы на аснове дырэктыў XVI зьезду УсеКП(б), у адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага пэрыяду — набывае значэньне важнейшай палітычна-гаспадарчай кампаніі.

У бягучым годзе перазаключэньне калдагавораў мела яшчэ асаблівае значэньне таму, што яно праводзілася непасрэдна на прадпрыемствах паміж фабзаўкамамі і адміністрацыяй у той час, калі ў мінулыя гады амаль усе калдагаворы заключаліся паміж цэнтральнымі праўленьнямі саюзаў і адпаведнымі гаспадарчымі аб'яднаньнямі.

Зараз мы маем магчымасьць надвесьці папярэднія вынікі перазаключэньня калдагавораў на БССР на 1931 г.

Папярэднія вынікі паказваюць, што калдагаворная кампанія праходзіла пры далейшым значным росьце энтузіязму і актыўнасьці рабочых мас. Значэньне калдагавору, як двухбаковага абавязацельства, рабочая маса поўнасьцю ўсьвядоміла. Пры абгаварэньні калдагавораў, на паасобныя клясава-варожыя выступленьні, якія мелі месца на некаторых прадпрыемствах, рабочы калектыў у цэлым даў самы рашучы бальшавіцкі адпор.

Навесьнаньне сходаў на абгаварэньні праекту дагавораў даходзіла ў сярэднім да 90-95 проц., а на некаторых прадпрыемствах — да 95 і нават 100 проц.

На гарбарні «Бальшавік» за час калдагаворнай кампаніі ёсьць значны прыліў ударнікаў. Самазамацавалася на прадпрыемстве да канца пяцігодкі 437 рабочых. 48 рабочых-ударнікаў з вялікіх вытворчым стажам падалі заявы аб прыёме ў партыю. На фабрыцы «Праца» ўцягнута 290 новых ударнікаў, арганізавана 9 вытворчых камун з 48 рабочых. На магілёўскай гарбарні імя Сталіна арганізавана «сквозная» брыгада з 35 рабочых: 63 рабочых-ударнікі падалі заявы ў партыю і 20 — у камсамол. На менскай абутковай фабрыцы арганізаваны 32 ударныя брыгады, 5 вытворчых камун, 8 брыгад па выпуску ўзорчай прадукцыі.

На гарбарні «Бальшавік» 632 добраахвотнікі прымалі ўдзел у папярэдняй прапрацоўцы прамфінпляну. Рабочыя пэрэшнага хромавага цэху прынялі на сустрэчным павышэньне пляну на 16.06 проц. Так і на іншых цэхах. Паасобныя ўдарныя брыгады прынялі абавязацельствы не дапушчаць браку, або давесьці яго да мінімуму. Рабочыя менскай абутковай фабрыкі абавязаліся не дапушчаць адхіленьня ад першага гатунку. На чаць адхіленьня ад першага гатунку. На гомельскім заводзе «Пралетары» ёсьць рост ударніцтва за час калдагаворнай кампаніі на 350 рабочых; 70 ударнікаў Папесдруну прыліў новых ударнікаў складае 250 чал.

За час калдагаворнай кампаніі нагнятаецца вялікі прыліў рабочых прапаноў на рацыяналізацыі вытворчасьці. Значная колькасьць прапаноў паступіла на палепшэньні ўмоў працы, палепшэньні арафработы, работы клапарацыі і г. д.

Асабліва ямат заўваг выклікала справа ўліку рабочых прапаноў, якія, за некаторым выключэньнем, надта марудна разглядаюцца і яшчэ марудней рэалізуюцца. Недарма рабочыя амаль усюды патрабавалі пры абгаварэньні дагавораў уняесьніе пункту аб вызначэньні цьвёрдых тэрмінаў разгляду рабочых прапаноў і інфармацыі аўтараў аб далейшым іх лёсе.

Буйнейшы недахоп пры заключэньні калдагавораў — гэта тое, што ня было аддана належнай увагі якасным паказальнікам, а таксама выпуленьню пішкаў рабочай сілы. Мы мелі вельмі слабы ўдзел часткі гаспадарнікаў у калдагаворнай кампаніі як у часе праверкі, так і ў часе другога этапу калдагаворнай кампаніі. Многія гаспадарнікі ня лічылі гэта сваёй справай. Адсюль рад скажэньняў — моманты хвасьцізму, жаданьне хавацца за сьпіной прафсаюзаў і лішняе суцяжніцтва. Гэта мела месца на бабруйскім камбінаце і на радзе іншых прадпрыемстваў. А намесьнік дырэктара «Чырвонай Бірэзіны» і «Пралетарскай перамогі» проста сказаў, што яму «няма часу аддаць належную ўвагу калдагаворнай кампаніі, бо ён вельмі заняты прамфінпляном».

Яўна няўважлівыя адносіны да дагавору мы мелі з боку паасобных партыйных і прафэсыянальных арганізацый на гуце імя Дамбаля, на некаторых прадпрыемствах у Бабруйску і інш. У артанскім ЦК сакратар парт'ячэйкі склікаў партыйны сход якраз на такі час, на які быў назначан сход на абгаварэньні дагавору. На акулярнай фабрыцы ў Віцебску фабрычныя арганізацыі падтрымлівалі яўна рвацкія патрабаваньні. Зусім слабыя тэмпы былі праўлены паасобнымі навытворчымі саюзамі, як ЦП саюзу мэдсанпрацы, саўгандальслужачых, ня было з іх боку належнага кіраўніцтва калдагаворнай кампаніяй, у асаблівасьці на радзях.

ЦП саюзу саўгандальслужачых ня былі ўлічаны ўмовы раёну. Замест таго, каб прапрацаваць і разьвесьці на месцы тыпавыя дагаворы дапасавальна да характару ўстаноў і груп работнікаў — ЦП абмежаваўся высылкай на месцы бюлетэня ЦК саюзу з тыповым дагаворам (яшчэ ад 5 кастрычніка), а потым прапанавала кіраўніцтва адначасова прыкладным дагаворам УсеЦСПС. Фармальна работа выканана, але, на сутнасьці, такое становішча вельмі затрудніла месцы, якім прыйшлося на падставе раздробленых матар'ялаў складаць праекты дагавора

Напярэдадні 13 гадавіны РСЧА

НЕ ПАСЛАБЛЯЙЦЕ УВАГІ да вярбоўкі ў вайсковыя школы

Арганізуйце масавую падрыхтоўку да юбілею Чырвонай арміі

Распачаць вярбоўку ў вайсковыя школы

ЦК УсеЛКСМ прапанаваў шырока разгарнуць вярбоўку камсамольцаў у вайсковыя школы. Кандыдатуры завербаваных павінны абмяркоўвацца на камсамольскіх сходах.

Юбілей Чырвонай арміі цесна зьвязваецца з пачаткам вярбовачнай кампаніі ў ВНУ. Кіраўніцтва вайскова-навучальных устаноў РСЧА ўжо распрацавала падрабязны плян правядзеньня кампаніі.

Павялічваецца лік асоб, якія прымаюцца ў вайсковыя школы.

Пры вайсковых школах будуць адкрыты падрыхтоўчыя курсы з аднагадовым і 6-месячным тэрмінамі навучаньня.

Райвыканкомы павінны зараз-жа стварыць вярбовачныя камісіі з уключэньнем у іх прадстаўнікоў камсамолу і Асоавіяхіму. У мінулым годзе райвыканкомы аддалі мала ўвагі вярбовачнай кампаніі.

Вайсковыя школы арганізуюць у гадавіну Чырвонай арміі шырокія ваянізаваныя паходы моладзі ў школы для азнаямленьня з бытам курсантаў.

Ячэйка Асоавіяхіму Камвузу сьпіць

Апрача праграмных гадзін па-завайсковай падрыхтоўкі вайсковая работа сярод студэнтаў Камвузу амаль не праводзіцца.

Работы такой адказнай грамадзкай арганізацыі, як Асоавіяхім, няма. Сярод студэнтаў ёсьць нялікая запазычанасьць па членскіх узносах Асоавіяхіму—за год-два.

Камвузаўцам трэба ведаць пра ваенную арганізацыю нашых ворагаў-суседзяў, ведаць першапачатковыя баявыя і агнявыя адзінкі іх армій, з якімі будуць весьці непасрэдную барацьбу нашы аддзяленьні і разьдзелы.

Перш чым біць ворага, яго трэба ведаць.

Таксама трэба ведаць і ўмець карыстацца сваёй зброяй, трэба навучыцца ўладаць вінтоўкай, ведаць усе ле>ўласьцівасьці, навучыцца добра страляць, умець карыстацца сродкамі ад хэмічнага нападу, ад нападу авіяцыі. Трэба ведаць, як жыве і вучыцца на сёньняшні дзень наша Чырвоная армія, у якую мы ўвальлемся ў часе вайны.

Амаль уся гэта работа ў ячэйцы Асоавіяхіму Камвузу не праводзіцца. Ніякіх гурткоў няма. Лекцыі і гутаркі не праводзяцца. Вайсковай літаратуры студэнты ня чытаюць. Вайсковыя газэты і часопісі ня выпісваюцца. Сувязі з часьцямі Чырвонай арміі, экскурсій у палкі і вайсковую школу няма.

Цір пачалі будаваць яшчэ ў верасьні 1930 г., больш сьвядомая частка студэнтаў—членаў Асоавіяхіму вышла на адзін суботнік і ўсё. На сёньняшні дзень стралковы цір не закончан, матар'ял (дошкі, бярвеньні) гніе, валяючыся на дварэ пад сьнегам. Страляць няма дзе, а арганізацыя Асоавіяхіму нічога ня робіць і ціру ня думае канчаць.

Такога становішча з пытаньнем ваянізацыі і такой работы ячэйкі Асоавіяхіму далей нельга цярпець. Трэба зараз-жа па-бальшавіцку ўзяцца і за гэты адсталы вучастак работы на нашым навучальным фронце. Гарадзкі савет Асоавіяхіму павінен дапамагчы камвузаўскай арганізацыі ў гэтай справе.

Піпін Скурат.

Дамо добра падрыхтаваныя кадры

З мэтай палепшыць падрыхтоўку рабочай моладзі, якая паступае ў вайсковыя школы, пры АБВШ з 10 сакавіка пачнуць працаваць цэнтральныя курсы па падрыхтоўцы ў вайскова-навучальныя ўстановы.

Гэтыя курсы разьлічаны на 100 чалавек рабоча-батрацкай моладзі, якія падалі заявы аб уступленьні ў вайсковыя школы і маюць слабую агульнаасьветную падрыхтоўку. Курсы разьлічаны на 6-7 месяцаў.

У буйных прамысловых гарадох БССР (Гомель, Віцебск, Бабруйск) будуць таксама адкрыты курсы па падрыхтоўцы ў вайсковыя школы, разьлічаныя на 50 чалавек, якія будуць праходзіць навучаньне на курсах, сумяшчаючы гэта з работай на прадпрыемстве.

Новы асеньні набор у АБВШ павінен даць ня менш 70 проц. рабоча-батрацкай праслойкі, лепшых ударнікаў і рабочых вытворчасьці. 30 проц. запоўняцца калгаснай і бядняцка-серадняцкай моладзьдзю.

Вялікую работу павінны правесьці камсамольскія арганізацыі, якія павінны зьвяцца ініцыятарамі вярбоўкі і вылучыць са свайго асяродзішча лепшых актывістаў-камсамольцаў.

Папярэднія весткі з месц гавораць аб тым, што вярбоўка праходзіць нездавальняюча, і трэба ўсім арганізацыям значна ўзмацніць сваю ўвагу да гэтай важнай палітычнай кампаніі.

С. К.

У хэмічнай лябараторыі

Малюнак работы Барысаўскага райсавету Асоавіяхіму

Працоўныя масы Барысаўшчыны ўзмацняюць абароназдольнасьць краіны, пашыраючы ваянізацыю працоўных, мабілізуючы сродкі для абароны і г. д.

Але-ж Барысаўскі райсавет Асоавіяхіму ня кіруе гэтай работай і спадзяецца на самацёк.

Асоавіяхімаўскія ячэйкі, якія павінны мабілізаваць увагу працоўных да ваянізацыі, працуюць вельмі слаба, а некаторыя і зусім не працуюць, напрыклад, ячэйкі друкароў, саюзу мэдсанпрацы, заводу «Мэталіст», «Пралетарская перамога» і інш.

Ня лепшая справа і ў вясковых ячэйках. Ёсьць такія сельсаветы, якія да сёньняшняга дня яшчэ ня маюць ніводнай ячэйкі Асоавіяхіму (Карсакоўскі сельсавет).

Прычынай такой работы аьяўляецца адсутнасьць пастаяннага і штодзённага кіраўніцтва з боку райсавету Асоавіяхіму.

Ня гледзячы на пастановы бюро райкому КП(б)В аб уключэньні ў плян работы па ваянізацыі, парт'ячэйкі ня выконваюць гэтых пастаноў, а РК не правярае выкананьня сваіх пастаноў.

РК у сваім квартальным пляне работы — сьнежань-сакавік — нічога не сказаў аб ваянізацыі, ня гледзячы на тое, што за гэты час адбудзецца 13-я гадавіна Чырвонай арміі і ўжо адбыўся 50-гадовы юбілей тав. Варашылава.

Райсавет Асоавіяхіму два разы склікаў прэзыдыум, але-ж ён не сабраўся. Нарэшце, райсавет ня мае памяшканьня для работы.

Падрыхтоўка да юбілею Чырвонай арміі праходзіць вельмі слаба. Шырокія масы рабочых ня ўцягнуты ў падрыхтоўку да сьвята.

У часе справаздачна-перавыбарчай кампаніі гарсавету працоўныя прапанавалі набудаваць дом абароны краіны і арганізаваць пры гарсавеце вайсковую секцыю, але-ж гэта прапанова амазана.

ПАЛКАВЫ.

Мартынюк „дапамагае" ўзмацняць абарону

Усе пачынальні Пухавіцкага райсавету Асоавіяхімбу наладзіць масавую асоавіяхімаўскую работу і павялічыць збор сродкаў у фонд абароны краіны прапальваюцца, бо насустрач гэтым пачынаньням ня ідзе загадчык пухавіцкага нардому Мартынюк.

Калі ў «дэкаду абароны» райсавет Асоавіяхіму наменіў правесьці рад платных спэктакляў і кіно-пастанорак, дык «заг.» Мартынюк як можна стараўся перашкаджаць правядзеньню гэтага пляну.

Райсавет выпісаў з Белдзяржкіно карціны, а Мартынюк папрасіў за пуск карціны па 10 руб., быццам на амартызацыю, што фактычна патрабуе выдатку ў некалькі капеек. Апрача гэтага ён патрабаваў заплаціць кіно-мэханіку ў той час, калі кіно-мэханік Пятроўскі заявіў, што ён ад платы адмаўляецца, бо ўсе грошы ад кіно-спэктаклю ідуць у фонд абароны краіны.

Члены драмгуртка згадзіліся паставіць п'есу «Кануп» з тым, каб збор пайшоў у фонд абароны, але Мартынюк «прыцыпова» заявіў, што сцэны ён ня дасьць.

Цяпер ніякай падрыхтоўкі да юбілею Чырвонай арміі народны дом не праводзіць, юбілей Варашылава таксама быў вельмі слаба адзначан у масавай рабоце нардому.

Усё гэта гаворыць аб тым, што пухавіцкі нардом з-за кіраўніцтва Мартынюка да пытаньняў абароны краіны яшчэ не павярнуўся.

Можа з гэтай заметкі зробяць адпаведныя вывады пухавіцкія кіруючыя арганізацыі.

На буксір вайсковую работу

Праведзеным абсьледваньнем ячэек Асоавіяхіму шпалернай фабрыкі, Мэталятрэсту і 4-ай школы выявілася, што там ніякай работы не праводзіцца.

Партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі няўважліва адносяцца да вайсковай работы ў вышэй адзначаных прадпрыемствах.

З боку партыйных арганізацый гэтых прадпрыемстваў назіраецца дрэнная кіраўніцтва грамадзкімі арганізацыямі, дырэктывы партыі ня выконваюцца. Усё гэта гаворыць аб тым, што на практыцы ў гэтых ячэйках ёсьць праваапартуністычныя адносіны да вайсковай работы і абароназдольнасьці краіны.

Можа надыходзячая кампанія юбілею Чырвонай арміі разварушыць гэтыя ячэйкі.

ГУЛІДА.

ЗБОР АВІЯХІМАТРАДА,

імя 2-га Усебеларускага зьезду Асоавіяхіму пры ЦП саюзу друкароў

ДЛЯ ЧАРГОВЫХ ЗАНЯТКАЎ

Яўка для равіціхіязаняткаў у 11 гадз. раніцы, а для вячэрніх а 8 гадз. увеч.

За 100 проц. яўка адказваюць ФЗМК.

Кам. атр.

МЕНСК

Новы склад прэзыдыуму гарсавету

Т. т. Каранеўскі і Бяркоўскі—намесьнікі старшыні гарсавету

На першым пленуме новага гарсавету членамі прэзыдыуму гарсавету абраны т. т. **Валодзька** (старшыня), **Шалкавец** (сакратар), **Каранеўскі, Бяркоўскі, Кавальчук, Шпэктараў, Вароніч, Цімашэнка, Нісенбаум, Дзічкоўскі, Пінхасін, Нахамава, Позьняк** (дырэктар Эльводу), **Дамброўскі, Кумкес, Кеніг, Багданава, Гродзіс і Левін.**

Кандыдатамі—т. т. **Млодак, Неміг, Ламака, Эльперын, Позьняк, Янковіч і Маслакоў.**

***

Учора на першым пасяджэньні новага прэзыдыуму гарсавету былі абраны намесьнікі старшыні гарсавету. **Першым намесьнікам абран тав. Каранеўскі** (былы загадчык Менакрэа), **другім намесьнікам—рабочы друкарні імя Сталіна, тав. Бяркоўскі.**

Дактароў—на пасеўную кампанію

Саюз мэдсанпрацы пастанавіў камандыраваць у раёны БССР 16 менскіх дактароў на веснавую пасеўную кампанію. Дактары прабудуць у раёнах тры месяцы.

***

Гарадзкая нарада галоўных дактароў Менску пастанавіла ў парадку грамадзкай нагрузкі камандыраваць у Менскі прыгарадны раён некалькіх дактароў на час пасеўнай кампаніі.

Разбуйненьне саюзу будаўнікоў

Закрыўся пленум саюзу будаўнікоў. Пленум падагуліў вынікі пятага пленуму УсеЦСПС і абгаварыў пытаньні разбуйненьня саюзу.

Пленум пастанавіў рэарганізаваць саюз будаўнікоў у тры саюзы: саюз рабочых прамысловага і жыльлёва-камунальнага будаўніцтва з колькасьцю 20 тыс. членаў саюзу, рабочых керамічнай прамысловасьці — 2 тыс. членаў саюзу і рабочых чыгуначнага, партовага і мясцовага дарожнага будаўніцтва—з 9 тыс. членаў саюзу.

Пастаноўлена склікаць у першай палове сакавіка Усебеларускія зьезды рабочых першых двух саюзаў. Зьезд саюзу рабочых чыгуначнага, партовага і мясцовага дарожнага будаўніцтва будзе склікан у канцы красавіка.

Вымова за нядбайныя адносіны да экспарту

15 лютага адбылося пасяджэньне экспартнай нарады пры **ЭКАНА БССР**, дзе ўсе арганізацыі, якія займаюцца экспартам рабілі справаздачы аб выкананьні даных im заданьняў.

За няўвагу на пасяджэньне абвешчана вымова з апублікаваньнем у друку кіраўніку Белплодагароднины т. **ЦОФІНУ** і нам. кіраўніка Белчяса тав. **КІСЕЛЬЕРУ.**

Трамвайная ветка Серабранка-Кальварыя

Гарсавет ухваліў правесьці ў бягучым годзе трамвайную ветку па лініі Серабранка-Кальварыя.

Лінія будзе праведзена з Чэрвеньскага тракту праз чыгуначны пераезд на Сьвярдлоўскую—Савецкую пасьля на Валадарскую, Інтэрнацыянальную, Рэспубліканскую, на Кальварыю праз чыгуначны пераезд.

4-хдзенная ўсесаюзная вытворчая нарада па радыё

З 18 лютага на працягу 4 дзён Культпропам ЦК УсеКП(б), НАРКАМЗЕМАМ СССР і КАЛГАСЦЭНТРАМ СССР праводзіцца вытворчая нарада — радыё па пытаньнях падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны.

У нарадзе прымуць удзел усесаюзныя рэспублікі і вобласьці. З рапартамі выступіць рад калгасаў, саўгасаў і аднаасобных гаспадарак.

Гэта нарада па радыё мае вялікае палітычнае значэньне. Рашаючыя задачы другой калгаснай вясны патрабуюць ад нас добрай бальшавіцкай падрыхтоўкі. Без належнай падрыхтоўкі да вясны мы ня здолеем выканаць адказныя задачы, пастаўленыя партыяй у сёлетнюю другую бальшавіцкую вясну.

На тэрыторыі СССР ёсьць нямала вобласьцяй, раёнаў, калгасаў, якія пабальшавіцку змагаюцца за вырашэньне задач другой бальшавіцкай вясны. Гэты прыклад гэраічнага змаганьня за вырашэньне дырэктыў партыі можа быць лепшым настаўнікам для адстаючых, лепшым дапаможнікам у справе зьнішчэньня ўсіх перашкод на шляху падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны.

Перавага вытворчай нарады па радыё заключаецца ў тым, што будучы на месцы праз радыё-прыёмнік кожны з нас можа прыняць актыўны ўдзел у рабоце вытворчай нарады.

Нарада будзе праводзіцца на працягу 4 дзён. 21-га лютага бярэ ўдзел БССР. Уступнае слова НКЗ БССР, далей рапартуюць: жывёлагадоўчы саўгас «Вязынь-Фаніпаль» і калгас імя 12 зьезду КП(б)Б, сьвіназводчы саўгас Вялінь-Сінча. Парт. і прафарганізацыі павінны зараз-жа арганізаваць калектыўнае слуханьне перадачы вытворчай нарады (21 лютага—з 20 да 22 гадзіны), забясьпечыць поўнае выкарыстаньне ўсіх матар'ялаў нарады.

Як будуць разьмяркоўвацца адпускі?

Пастанова калегіі НК РСІ Беларусі ад 11 лютага 1931 г.

Выходзячы з таго, што да гэтага часу па некаторых наркаматах і ведамствах адпускі працаўнікоў не распачаты, калегія НК РСІ Беларусі пастанаўляе:

1. Прапанаваць усім наркаматам, ведамствам і казпэрацыйна-гаспадарчым установам безадкладна прыступіць да практычнага ажыцьцяўленьня пастановы ЦКК УсеКП(б) ад 23-XII—30 г. аб прадастаўленьні адпускоў на працягу ўсяго году.

2. НКП распрацаваць пастанову аб скарыстальні пэрыядычных адпускоў на працягу году з такім разьлікам, каб у зімовы час ішло ў водпуск 8 проц. працаўнікоў, а ўлетку—12-15 проц. Адначасова прыняць адпаведныя захады па забясьпячэньні адпускнікоў дамамі адпачынку і адпаведным культурным абслугоўваньнем, адпачываючых у зімовы час.

3. Пры накіраваньні на курорты, на санаторнае лячэньне ўлічваць чарговыя адпускі.

4. Наркамасьветы прыняць адпаведныя захады ў адносінах арганізацыі экскурсій у зімовы пэрыяд, як у межах БССР, так і па-за межы БССР, а Белдзяржкіно забясьпечыць дамы адпачынку патрэбнай колькасьцю ідэалёгічна-вытрыманых кінофільмаў.

5. Прасіць ЦСПСБ правесьці растлумачальную кампанію праз прафсаюзы аб адпусках на працягу ўсяго году.

6. НК Аховы здароўя безадкладна прыступіць да практычнай дзейнасьці ў адносінах закупкі патрэбнай колькасьці курортных месц, аб павялічэньні броні курортных месц і іншых мерапрыемстваў, якія ў поўнай меры забясьпечваюць бесьперабойнасьць адпускоў на працягу году.

Нарком РСІ Бел.

КАЛНІН.

Паведамленьні

— Сьпіс таварышоў, мабілізаваных Менгаркомам КП(б)Б па правядзеньні мабілізацыі сродкаў у прыгарадных сельсаветах.

Штэйнгольц — саюз харчав., Фрыдман — СНК, Іваш чанка — НКФ, Варушыла — ЦКК-РСІ, Базіленка — Белмяса, Лынькоў — БДВ, Дзічкоўскі, Маслакоў — гарсавет, Камінская — Белшчаціна, Гурскі — Галоўмастацтва, Ётвіч — ЦСПСВ, Сьвірыноўская — працасьветы, Варопічаў — зав. «Ударнік», Каган — ф-ка тэкстыльнич., Давідовіч — друк. імя Сталіна, Паўловіч—лямцавая ф-ка. Памянёныя таварышы павінны зьявіцца 19-II—31 г., у 3 гадз. дня, у гарком (заля пасяджэньняў, 3-ці паверх).

— 20 лютага, у 6 гадз. веч., у Культпропе ЦК КП(б)Б, пакой 12, адбудзецца нарада польработнікаў, на якую павінны абавязкова зьявіцца: Будзінскі—«Зьвязда», Прынц, Кірштэйн, Ратквіч — «Орка», Зарэмбскі, Губэр, Тышкевіч — Наркамасьветы, Вансоўскі, Дразоўская — нацкамісія, Віткоўскі, Будкевіч, Рымашэўскі, Квяткоўскі, Герман—акадэмія, Бурсьцін, Сякерская, Дамброўскі — пэдфак, Ельнаў, Росьлін, Дзяржынская — студэнты, Гаеўскі, Вітлін — ЦК КП(б)В, Булат — 33 польск. школа, Мальц — 6 польск. школа, Міклуш, Шыманская — клюб Р. Люксэмбург, Клыс — Дзяржынян, Валешка — Цэнтравыд., Кеніг — гарком, Апольскі, Альтінская, Сьмірнова — камвуз, Кукедка, Сяліцкі, Куркевіч — польпэдтэхнікум, Длугакенскі — БДВ.

Культпроп ЦК КП(б)Б.

— Дом Камасьветы. 20-II—31 г., роўна ў 7 гадз. веч., у Доме Камасьветы імя К. Маркса (пакой № 6, уваход з бул. К. Маркса) адбудзецца групавая кансультацыя для членаў рэдкалегіі і рабкораў па тэму: «Нізавы друк у змаганьні за транспарт». Даклад інструктара ЦК КП(б)Б.

— Культпроп Менгаркому КП(б)Б 21-II—31 г. роўна ў 5 гадз. вечара, у залі пасяджэньняў гаркому (3-ці паверх) склікае нараду з нарадкам дня:

1) Даклады з месц загадчыкаў дзённых і вячэрніх рабфакаў, рабочага універсытэту аб становішчы рабфаку і вячэрняга рабочага універсытэту. 2) Аб работе пазьменных груп на вячэрніх рабфаках, вячэрнім рабочым універсытэце і рабочым вячэрнім палітэхнікуме. 3) Рознае. На нараду павінны абавязкова зьявіцца загадчыкі і сакратары ячэек КП(б)Б рабфаку, рабочага вячэрняга універсытэту, рабочага вячэрняга палітэхнікуму.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і галоўная кантора Менск, Савецкая, 63.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	13-80	Начны рэдактар	6-12
Сакратар	10-74	Галоўная кантора	7-31
Сэктар інфармацыі	6-19	Аддзел падпіскі	7-31
		Сэктар абвестак	7-31

Умовы падпіскі
(з дарожным аддзелам „Прафрух")

На 1 мес.	—	1 р.
„ 3 мес.	—	3 „
„ 6 мес.	—	6 „
„ 12 мес.	—	12 „

Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.

Цэна за абвесткі:
За радок пошп. памеру тэксту—50 к., іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Пасярэд тэксту—у два разы даражэй. Кантакарэнтны рахунак выдавецтва № 52100501 у Дзяржбанку

Абвесткі прымаюцца ў канторы выдавецтва „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая 63, 2-гі паверх тэл. 7-31.

Сёньня, 19 лютага. Паказ для саюзу камунельнікаў. Пач. а 9 гадз.

Беларускі другі дзяржаўны тэатр
В. Кіршон.
РЭЙКІ ГУДУЦЬ
П'еса ў 5 дзеях, 12 абразох.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
З прычыны выключнага посьпеху яшчэ тры дні Гукавы фільм оправа
13 ДЗЁН «ПРАМПАРТЫІ»
ХРОНІКА СЯЮЗКІНО № 1 за 1931 г.
Каса—з 5 г.—Пачатак сэансаў: 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 30 м.

Кіно-тэатр „Культура"
КІНО ЗАКРЫТА да 2 сакавіка.

КІНО „Інтэрнацыянал"
Новы савецкі фільм вытв. „Працкіно"
ЖАНЧЫНА Ў ЛЕСЕ
Пач. 1 сэансу ў 6 г.—Каса—з 4 г.30 м.

КІНО „Піяняры"
Апошнія 3 дні 16, 17 і 18 лютага мастацкі фільм паводле раману ШОЛОМ-АЛЭЙХЭМА
МАБУЛ (Крывавы паток)
драма ў 9 частках.
Пач. 6 г., 7 г. 30 м., 9 г., 10 г. 30 м.
Каса—з 4 гадз.

Кіно „Юны Піянэр"
Два фільмы у 1 сэанс
1) ПРЫГОДЫ АРЫШКІ ў 5 частк.
2) Сенька Афрыканец ў 2 частк.
Пач. сэансаў з 1 г. д. Каса—з 12 г.

КІНО „СПАРТАК"
2-гі ТЫДЗЕНЬ 2-гі
ігар ільлінскі ў камедыі
ЗАКРОЙШЧЫК З ТАРЖКА
ў 6 частках.
ШТОДЗЕННА 4 СЭАНСЫ
Пачатак: 1 с.—у 7 г.
2 с.—у 8 г. 15 м.
3 с.—у 9 г. 30 м.
4 с.—у 10 г. 45 м.
КАСА—з 5 гадз.

ПРАВОДЗІЦЦА НАБОР
НА
САДОВА-ГАРОДНЫЯ КУРСЫ
пры МЦРК на 20 чалавек.
У першую чаргу прымаюцца жанчыны.
Узрост — ад 18-30 год. Асьвета—3-4 групы
ТЭРМІН НАВУЧАНЬНЯ—ДВА МЕСЯЦЫ
Курсанты забясьпечваюцца стыпэндыяй па 25 руб. у месяц.
Для прыяжджаючых—інтэрнат.
Па сканчэньні курсаў слухачы абавязаны працаваць у прыгарадных гаспадарках МЦРК на працягу двух год.
Заявы з прыкладаньнем даведкі аб праве голасу падаваць у аддзел кадраў МЦРК (Савецкая, 43, трэці паверх).

КАР'ЕР ПА ПЯСКУ на Іванаўскай вул.
ЗАЧЫНЕН з тае прычыны, што апошні пагражае абвалам і могуць быць ахвяры.
Асобы, якія будуць раскапваць памянёны кар'ер, будуць прыцягнуты да адказнасьці да арт. 151 к. к.
МЕНКАМГАС.

Гукавы кіно-тэатр
„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
Сёньня і штодзённа гукавы фільм
13 ДЗЁН
(СПРАВА „ПРАМПАРТЫІ")
Для калектыўн. глядача папярэдні продаж білетаў у тэатральн. рабочай касе.
Пачатак сэансаў: 7 г., 8 г. 45 м. і 10 г. 30 м.
Каса адкрыта а 5 гадз.
Асобы, якія спазьніліся, на сэанс не дапушчаюцца.

ЧАЧЭРСКІ СЬВІНАГАДОЎЧЫ ТЭХНІКУМ
АБВЯШЧАЕ
ВЕСНАВЫ НАБОР
НА ПЕРШЫ КУРС ТЭХНІКУМУ.
Заявы падаюцца па адрасе: м. Чачэрск (Гомельшчына), сьвінагадоўчаму тэхнікуму да 10 сакавіка 1931 г. з прыкладаньнем усіх дакумантаў, згодна даведніку НКА за 1930-31 год.
З 10 па 15 сакавіка праводзяцца іспыты асобам, якія на маюць права паступіць у тэхнікум бяз іспытаў.
Студэнты забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй, як і ў іншых тэхнікумах.
Заняткі пачынаюцца з 1 красавіка 1931 г., аб чым залічаным будзе паведамлена пэрсанальна.
Дырэктар тэхнікуму СУКОНЬНІКАЎ.

СЬВІНАВОД АДКРЫВАЕ
КУРСЫ СТАРШЫХ СЬВІНАРОЎ ПРАЦЯГАМ У 3 МЕСЯЦЫ
МЕСЦА КУРСАЎ—СЬВІНАГАДОЎЧАЯ СТАНЦЫЯ, БАРЫСАЎСКІ ТЭХНІКУМ І ДВА САЎГАСЫ СЬВІНАВОДА.
НА КУРСЫ ПРЫМАЮЦЦА: 1. Асобы, камандыраваныя партыйнымі, камсамольскімі і прафсаюзнымі арганізацыямі. 2. Батракі. 3. Рабочыя саўгасаў. 4. Калгаснікі. 5. Дамабілізаваныя чырвонаармейцы. 6. Беднякі, сераднякі-сяляне.
На курсы будуць прымацца асобы, якія скончылі ня менш 4-хгодкі, пажадана скончылі ўшкм, сельгаспрафтэхшколы і сямігодкі.
Асобы, падаючыя заявы, павінны быць добра знаёмы з сельскай гаспадаркай.
Заявы патрэбна дасылаць у прыймовую камісію пры Белканторы трэсту Сьвінавод (Менск, Савецкая, 70) да 5 сакавіка.
Да заявы прыкладаюцца наступныя дакуманты:
а) аб адукацыі, б) аб сацыяльным становішчы і непазбаўленьні выборчых правоў, в) копію акладнога ліста для сялян, а для рабочых даведка аб заработку, г) калі працуе, то спраўку ад адміністрацыі, што вызваляецца ад працы. Аб стане здароўя і аб узросьце.
Па сканчэньні курсаў усе паступаюць у распараджэньне Сьвінавода для пасылкі на працу ў саўгасы і павінны працаваць на менш 2-х год у саўгасе. Курсанты забясьпечваюцца памяшканьнем і стыпэндыяй 40 руб. у месяц (сорак руб.). Пачатак заняткаў будзе паведамлены.
Белкантора трэсту Сьвінавод.

Згодна абвесткі Дзяржбанку ў газэце „Зьвязда" ад 11-II 1931 г. № 40 усе арганізацыі, якія маюць кантакарэнт або бягучы рахунак у крэдытныя ўстановы, павінны былі не пазьней 15 лютага падаць
КАСАВЫЯ ПЛЯНЫ на САКАВІК месяц.
У сувязі з тым, што некаторыя арганізацыі яшчэ не падалі плянаў
БЕЛКАМУНБАНК ПАПЯРЭДЖВАЕ,
што арганізацыі, не падаўшыя сваіх касавых плянаў у Белкамунбанк
ДА 22 ЛЮТАГА г. г.,
будуць выключаны з касавага абслугоўваньня.
АДМІНІСТРАЦЫЯ.

КОЖНЫ ПРАЦОЎНЫ-ПАЛЯК
ПАВІНЕН ВЫПІСВАЦЬ І
ЧЫТАЦЬ СВАЮ ГАЗЭТУ
ОРКА
ОРКА
выходзіць 2 разы ў пяціднеўку
12 нумароў у месяц замест 8
НА РОДНАЙ МОВЕ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
на 1 год — 2 р. 20 к.
на 6 мес. — 1 р. 20 к.
на 3 мес. — — 60 к.
на 1 мес. — — 20 к.
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ЎСІМІ ПАШТОВЫМІ АДДЗЯЛЕНЬНЯМІ І ЛІСТАНОСЦАМІ

Магілеўскі пэдагагічны інстытут
АБВЯШЧАЕ
ВЕСНАВЫ ПРЫЁМ студэнтаў
на сац.-гістарычнае аддзяленьне.
Пры аддзяленьні існуе польскі сэктар.
Заявы прымаюцца да 15 сакавіка.
З 20 па 25 сакавіка адбудуцца іспыты і залічэньне.
Заняткі пачнуцца з 1-га красавіка.
Дырэктар Воўкаў.

11 лютага ПАЕХАЛА з ДОМУ КАРАСІК Агафія Аліксеева з 3-гадовым сынам Леанідам.
Просьба да асоб, хто ведае яе месца жыхарства, паведаміць па адрасе: Менск, Маскоўская, 45, кв. 3, Караціку Ф. А.

ПАСЯДЖЭНЬНЕ ЖУРЫ
па конкурсе на дзіцячую кнігу
(якое не адбылося два разы з-за няўкі членаў)
склікаецца на 19 лютага
ў 7 гадзін у памяшканьні БДВ (рог Савецкай і Камсамольскай, 3-ці паверх).
У ПАРАДКУ ДНЯ—разьмеркаваньне прэмій. Павінны зьявіцца т.т. Лабадзеў, Панкевіч, Лынькоў, Гародкіна, Якімовіч, Паваротны, Александровіч, Колас, Турэцкая, Дрозд, Шпіцер.
Запрашаюцца пісьменьнікі, піянэр-працаўнікі, рабочыя літгурткі, настаўнікі, мастакі, работнікі дзіцячай кнігі.
БДВ І НКА.

МЕНСКАЯ ГАРАДЗКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ
АЎТАДОРУ
склікаецца 21-га лютага ў 6 гадз. вечара ў памяшканьні клюбу харчавікоў (рог Камсамольскай і Інтэрнацыянальнай).
Пасяджэньне францускі канфэрэнцыі—там-жа ў 5 гадз.
Яўка выбраных дэлегатаў абавязкова.
Запрашаецца аўтадораўскі актыў.

У выпадку неакуратнага атрыманьня газэты ЗВАНЕЦЕ па тэлеф. № 15-42

Менгарком КП(б)Б, ЦСПСБ і Гарсавет Асоавіяхіму
21-га лютага, у 6 гадзін вечара ў Доме Селяніна склікаюць
ЗЬЛЁТ БЫЛЫХ ЧЫРВОНЫХ ПАРТЫЗАН,
чырвонагвардзейцаў і нач. склад запасу.
Парадак дня: XIII-я гадавіна Чырвонай арміі і задачы абароны краіны.
Уваход для партызан па сваіх пасьведчаньнях, а іншым—па білетах, разасланых па прадпрыемствах і ўстановах.
Білеты атрымаць у гаркоме КП(б)Б з 19-II 31 г.
Пасьля ўрачыстай часткі—мастацкая частка.
Менгарком КП(б)Б; ЦСПСБ і гарсавет Асоавіяхіму.

Для здачы абвесткі у газэту „ЗЬВЯЗДА" званіце па тэл. 7-81

БАН
20 лютага ў 12 гадз. дня ў памяшканьні ІНСТЫТУТУ МОВАЗНАЎСТВА БАН
БУДЗЕ ПРАЧЫТАНЫ ДАКЛАД НА ТЭМУ:
„Аб узмацненьні інтэрнацыянальнага элемэнту мовы".
Запрашаюцца рабочыя, павуковыя працаўнікі, настаўніцтва.
Ін-т Мовазнаўства.

41 кіраўніцтва вайскова-будаўнічых работ
КУПЛЯЕ
коняй, сані, калёсны абоз, збрую.
З прапановамі зварачацца па адрасе: плац Волі, буд. № 23 (райваенкамат) штодзённа ад 10 да 14 гадз.

ЗГУБЛЕНЫ
дамацкія кнігі наступных дамоў: 1) дому № 12 на 1-й Незалежнінскай вул. Шэлепень Ф., 2) д. № 22 на Нова-Каменнай вул. Казлоўскага П. В., 3) д. № 11 на Кірылаўскай вул. Пілішчука Г. І., 4) д. № 57/12 на Стара-Віленскай вул. Сарокача П. В. Лічыць несапраўднымі.

Менск, друкарня «ЗЬВЯЗДЫ».

Менск, Галоўлітбел № 337.